

ЯК ПЕРАЖЫЦЬ СТРАТУ **11**

РЭПАРТАЖ З «ГОНКІ ЛЕГЕНДАЎ» **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛЮТАГА 2019 г. СЕРАДА № 34 (28901)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Праблема эфектыўнасці дзяржсектара — ключавая сёння. Цяпер мы працуем над тым, каб правесці дыягностыку нашых найбуйнейшых прадпрыемстваў. Каб разумець, хто пасля аказання дзяржпадтрымкі працуе, а каму трэба падставіць плячо, і прадпрыемства будзе працаваць паспяхова. І прадпрыемствы, якім падстаўляй ці не падстаўляй плячо, з-за розных прычын працаваць не будуць. Гэта самае складанае — што рабіць з апошняй катэгорыяй. Выдзяленне новых аб'ёмаў фінансавання для праблемных арганізацый урадам не разглядаецца. Дзяржпадтрымка можа быць аказана толькі ў выглядзе рэструктурызацыі наяўных абавязацельстваў».*

# Кошыкі ад Праскоўі



Былы медработнік з вёскі Альманы Столінскага раёна Праскоўя ПАЛУКОШКА даўно марыла навучыцца плесці кошыкі з лазовых пруткоў. Калі выйшла на пенсію і займела больш вольнага часу, па кнігах і часопісах асвоіла тэхніку незвычайнага пляцення мініяцюрных — у далонь — кошыкаў. У Альманах, як, зрэшты, і ў кожнай палескай вёсцы, адвеку была свая школа лозапляцення, але сувенірнымі, якія вырабляе Праскоўя Паўлаўна, не кожная вёска можа пахваліцца. Свае міні-кошыкі — сапраўднае мастацтва — майстрыха «гатуе» на звычайнай вясковай кухні.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Да 2023 года доля ІТ-сектара ВУП Беларусі можа вырасці да 10 %.
- **Больш за 430 цяжарнасцяў захавана ў Мінскай вобласці летась дзякуючы перадабортнаму кансультаванню.**
- У Беларусі зацверджаны новы парадак афармлення правілаў арганізацыі азартных гульняў.
- **Ва ўзросце 85 гадоў памёр сусветна вядомы мадэльер і стыліст Карл Лагерфельд.**



- Больш за 1,3 тысячы самагонных апаратаў канфіскавалі ў краіне ў 2018 годзе.


ISSN 1990 - 763X


Чвэрць стагоддзя 25

**Чарговую публікацыю рубрыкі «Чвэрць стагоддзя» аб самых важных дакументах, падпісаных кіраўніком дзяржавы, мы прысвячаем Дэкрэту № 18. У аснове матэрыялу — няпростая гісторыя адной жанчыны, якой дзеянне гэтага дакумента дапамагло захаваць дачку і спыніцца на краі бездані.**

# СТРАШНА БЫЦЬ «НЕ АБАВЯЗАНАЙ» СВАЙМУ ДЗІЦЯЦІ

## Аповед жанчыны, якая здолела вярнуць дачку з сацыяльнага прытулку

**Жанчыну, якая здолела не толькі вярнуць дзіця з прытулку, але і далей выхоўвае яго, знайсці аказалася не проста. Спецыялісты сацыяльна-педагагічных цэнтраў не заўсёды ахвотна ідуць на кантакт з журналістамі. Яны маюць рацыю, бо іх мэта не толькі дапамагчы сем'ям, якія аказаліся ў цяжкіх жыццёвых абставінах, але і пастарацца зберагчы той далікатны спакой, якога іх падапечныя дасягаюць не заўсёды простым шляхам. Але мне пашанцавала. Са мной згадзілася пагаварыць вельмі незвычайная і моцная жанчына. Яна не пабаялася расказаць аб сваіх памылках і пачуццях адкрыта. Мы сустрэліся з ёй у адным з мінскіх кафэ. Мне было прыемна ўбачыць перад сабой прыгожую 36-гадовую жанчыну. Яна ўсміхнулася мне і расказала, як ёй нязвыкла было першы час хадзіць з... зубамі. І мы пасмяяліся разам. А потым была доўгая размова. Некалькі разоў жанчына спыняла аповед: трэба было стрымаць боль і слёзы. Ёй не заўсёды гэта ўдавалася.**


СТАР. 4—5




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.




Зараз варта далей трымацца ад вадаёмаў

# ЗМАТВАЙ ВУДЫ

**Сёлетні люты зусім не адпавядае сваёй назве і больш нагадвае пазачарговы вясновы месяц. Апошнімі днямі і ўвогуле ўстанавілася сонечнае надвор'е, а слупок тэрмометра ўпарта рухаецца за 0 градусаў у бок павышэння. Адпавядае такой абстаноўцы і сітуацыя на вадаёмах. Ледзяное пакрыва пачынае імкліва разбурацца.**

— Надвор'е ўвогуле не характэрнае для дадзенага перыяду часу, — адзначае **старшыня Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.** — Цёплае сонейка, якое грэе ўжо па-вясноваму, топіць імкліва лёд. Мы ўвесь час праводзім маніторынг лядовага пакрыцця. Мушу зазначыць, што карціна дастаткова трывожная. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці такія рэкі, як Піна і Мухавец, не маюць паўсюдна трывалага лёду. Што датычыцца Віцебскай вобласці, то там становішча з лёдам на буйных азёрах захоўваецца стабільнае.


СТАР. 3

# ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

**Учора на нарадзе ў Прэзідэнта абмяркоўвалі дэмаграфічную сітуацыю і ўдасканаленне мер дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ніводная краіна ў свеце так не падтрымлівае сем'і з дзецьмі, як наша. Беларускі лідар звярнуў увагу, што ў Германіі досыць вялікія выплаты ў гэтай сферы, аднак узровень нараджальнасці практычна як у Беларусі. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў разабрацца ў сістэме падтрымкі сем'яў з дзецьмі і паглядзець, «можа, нам дзесьці ўзмацніць падтрымку, а дзесьці нейкую дробязь наогул прыбраць, якая не працуе».

Калі, напрыклад, будзе прынята прыстойнае рашэнне па забеспячэнні шматдзетных сем'яў жыллём, то гэта безумоўны стымул. «Жыллё для сям'і — гэта ўсё», — упэўнены Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў сферы дэмаграфічнай бяспекі наша краіна сутыкаецца з такімі ж праблемамі, як і большасць дзяржаў свету. Гэта зніжэнне ўзроўню нараджальнасці і павелічэнне натуральнага змяншэння насельніцтва. Калі не прымаць папераджальных мер, то, па прагнозах спецыялістаў, тэндэнцыі да зніжэння колькасці насельніцтва і яго старэння будуць толькі ўзмацняцца аж да 2040 года.

«Для падтрымкі сем'яў з дзецьмі ў Беларусі прыняты, я ўжо сказаў, выключныя меры. Сярод іх — адпачынак па доглядзе за дзіцем да трох гадоў, які аплачваецца, льготнае крэдытаванне для шматдзетных і праграма сямейнага капіталу, а таксама іншыя меры», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў удзельнікаў нарады адказаць на наступныя пытанні.

Па-першае, наколькі прынятыя меры эфектыўныя? «Прырост насельніцтва, павышэнне працоўнага патэнцыялу — пытанне нацыянальнай бяспекі, і для нас яно гучыць гэтак жа востра, як для іншых развітых краін», — падкрэсліў ён.

Па-другое, да гэтага часу існуюць недапрацоўкі з забеспячэннем шматдзетных сем'яў жыллём. «Мы пра гэта дамовіліся. 2021 год — мяжа, за якую непажадана выходзіць пры забеспячэнні шматдзетных сем'яў жыллём», — адзначыў Прэзідэнт.

Па-трэцяе, была прынята Праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь». Як яна выконваецца? Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што пакуль вядзецца вельмі шмат размоў пра здаровы лад жыцця, тады як дзеянняў у гэтай сферы не хапае. Прэзідэнт папярэдзіў прысутных: калі хоць адно яго даручэнне не будзе выканана, варта збірацца і сыходзіць.

«Я таксама патрабаваў ад міністра аховы здароўя прыняць комплексныя меры па зніжэнні смяротнасці. Хацелася б пачуць, што ў гэтым кірунку робіцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На думку беларускага лідара, задача — у найбліжэйшыя гады распрацаваць і рэалізаваць дзейсныя меры, накіраваныя на павелічэнне нараджальнасці насельніцтва Беларусі. Важна аддаць увагу фарміраванню ў грамадстве пазітыўнага і паважлівага стаўлення да мацярынства і сямейных каштоўнасцяў.

Пасля гэтага ён перадаў слова міністру працы і сацыяльнай абароны Ірыне Касцевіч.

«Прынятыя на дзяржаўным узроўні меры дазволілі дамагчыся, пачынаючы з 2010 года, адноснай стабілізацыі дэмаграфічнай сітуацыі, аднак гэтая тэндэнцыя не набыла ўстойлівы характар, пра што сведчаць вынікі апошніх двух гадоў. Нараджальнасць зніжаецца. У 2018 годзе нарадзілася менш за 95 тысяч дзяцей, што на 8 % менш, чым у 2017-м. Узровень смяротнасці застаецца досыць высокім. Памерла амаль 200 тысяч чалавек, што на 600 чалавек больш, чым у 2017-м. Вынікі 2018 года: колькасць насельніцтва паменшылася і склала амаль 9 млн 476 тысяч чалавек», — паведаміла яна.

Па выніках нарады міністр працы і сацыяльнай абароны праінфармавала журналістаў, што дапамога па доглядзе за дзіцем — гэта амаль 2,2 мільярда беларускіх рублёў выдаткаў і гэта амаль 1,8 % ад ВУП. Паводле ацэнкі экспертаў, каля 5 % ВУП выдаткоўваюцца наогул на падтрымку сем'яў — гэта і сямейны капітал, і жыллёвае будаўніцтва, і ахова здароўя, адукацыя, тыя льготы, якія сёння дзейнічаюць.

Паводле яе слоў, Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна зрабіць сур'ёзную інвентарызацыю ўсіх дапамог, усіх ільгот, усіх гарантый, якія сёння даюцца дзяржавай для сем'яў.

Што датычыцца нараджальнасці, міністр растлумачыла, што цяпер вырасла пакаленне 90-х гадоў мінулага стагоддзя, таму ў краіне скарачаецца патэнцыял жанчын дзетароднага ўзросту. Другі аспект — «трэба нарошчваць інтэнсіўнасць нараджэння дзяцей», а гэта залежыць ад спрыяльных умоў, стабільнай эканомікі, жылля і адпаведнага матэрыяльнага становішча ў сям'і.

Дарэчы, на нарадзе ў тым ліку абмяркоўвалі магчымасць правядзення першага ЭКА за кошт дзяржавы. «Сёння ёсць праблема з нараджэннем дзяцей, абумоўленая менавіта бясплоддзем, — расказала Ірына Касцевіч. — Як міністэрства, мы — за (увядзенне першага ЭКА за кошт дзяржавы. — **«Зв.»**). Гэта дазволіць нам з вамі ад паўтары да дзвюх тысяч дзяцей нарадзіць дадаткова ў Рэспубліцы Беларусь. Добрых, здаровых дзяцей. Чаму б не рухацца ў гэтым кірунку?»

...Пакуль усе ініцыятывы ад урада, Адміністрацыі Прэзідэнта, міністэрстваў і кіраўнікоў рэгіёнаў, выказаныя на нарадзе, засталіся на ўзроўні прапаноў. Кіраўнік дзяржавы даручыў сістэматызаваць усе напрацоўкі, правесці рэвізію льгот і яшчэ раз абмеркаваць гэтую тэму на Прэзідыуме Савета Міністраў. Губернатарам было даручана заняцца праблематыкай на месцах. Дапрацаваныя прапановы разгледзяць на чарговай нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, пасля чаго будзе прымацца канчатковае рашэнне.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# Дапрацоўваем супольна

## Адказнасць за праявы экстрэмізму будзе ўзмоцнена

**Праект закона «Аб змяненні законаў Рэспублікі Беларусь па пытанні ўзмацнення барацьбы з прапагандай нацызму і экстрэмізму» прыняты ў снежні ў першым чытанні. А на мінулым тыдні рабочая група ў расшыраным складзе абмяркоўвала папраўкі ў гэты дакумент для другога чытання.**

Акрамя дэпутатаў у пасяджэнні прымалі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў, Нацыянальнага цэнтра заканадаўчых і прававых даследаванняў, навуковых колаў, грамадскіх арганізацый і палітычных партый.

Неабходнасць удасканалення заканадаўства абумоўлена і фактамі рэчаіснасці.

«Прышчэпка супраць карычневай чумы ў наш час аслабла. Да майго вялікага здзіўлення, у XXI стагоддзі ў Рэспубліцы Беларусь нярэдкія выпадкі «зігавання», бравіраванне свастыкай, іншымі элементамі нацысцкай сімволікі. Па звестках праваахоўных органаў назіраецца значны рост зарэгістраваных у нашай краіне фактаў публічнага дэманстравання нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі. У сувязі з гэтым быў распрацаваны адпаведны праект, які накіраваны на супрацьдзеянне адзначаным тэндэнцыям», — растлумачыў **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Андрэй НАВУМОВІЧ.**

Сярод асноўных новаўвядзенняў — забарона на рэабілітацыю нацызму, прапаганду, публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне, захоўванне і набыццё з мэтай распаўсюджвання нацысцкай, экстрэмісцкай і тэрарыстычнай сімволікі і атрыбутыкі. За гэта праваПарушэнне, здзейсненае паўторна на працягу года, згодна з прапанаванымі змяненнямі ў артыкул КаАП, штраф павялічыцца ў два разы. Да крымінальнай адказнасці будуць прыцягваць за наўмысную публічную рэабілітацыю нацызму на роўных з распальваннем расавай альбо іншай сацыяльнай варожасці. Пералік забароненых сімвалаў і атрыбутыкі будзе размешчаны ў інтэрнэце.

У новым законе дадзена азначэнне тэрмінам «нацызм», «рэабілітацыя нацызму» і «нацысцкая сімволіка і атрыбутыка».

Адна з прапаноў датычылася распаўсюджвання дзейнасці прававога акта і на прадукцыю з нацысцкай сімволікай. Дэпутат Аляксей Сокал прапанаваў пераняць гэту практыку з расійскага заканадаўства.

Узмацненне адказнасці аж да крымінальнай неабходна і таму, што штрафы часам не даюць вынікаў. Але пры гэтым прысутныя адзначылі, што ўзмацніць трэба не толькі пакаранне, але і выхаваўчую работу.

Прадстаўнікі БДУ ў сваю чаргу выказалі думку, што ў шэраг дазволеных відаў дзейнасці, дзе выкарыстоўваецца забароненая сімволіка, трэба дадаць і навуковую работу.

На думку супрацоўнікаў МУС, удасканалення патрабуе і работа над экспертным аналізам экстрэмісцкіх, тэрарыстычных і нацыяналістычных матэрыялаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## СТАЛІЧНЫ ЧАС

**Для дастаўкі гледачоў з Мінска да месца правядзення чэмпіянату Еўропы па біятлоне, а таксама міжнародных спаборніцтваў па фрыстайле ў РЦАП «Раўбічы» з 18 да 24 лютага ў РЦАП «Раўбічы» ад станцыі метро «Барысаўскі тракт» курсіруюць аўтобусы спецыяльнага маршрута № 449Э, паведамілі ў ДП «Сталічны транспарт і сувязь». Інтэрвал руху складзе 10—15 хвілін.**

Колькасць заяўленых арганізацыямі горада ў дзяржаўную службу занятасці насельніцтва вакансій вырасла да 17,7 тыс., колькасць свабодных рабочых месцаў перавышае колькасць беспрацоўных амаль у 15 разоў, паведаміла **начальнік аддзела рынку працы ўпраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Святлана ЛЯВОНЧЫК.** У ліку найбольш запатрабаваных рабочых спецыяльнасцяў — арматуршчык, кіроўца аўтамабіля, муляр, кантралёр-касір, маляр, мантажнік, цясляр-бетоншчык, кухар, прадавец, тынкоўшчык. З ліку спецыяльнасцяў найбольш запатрабаваныя інжынер, медыцынская сястра-спецыяліст, урач-спецыяліст, менеджар, фельчар, бухгалтар, выхавальнік, майстар, фармацэўт.

**У Беларусі, як паведамляе БелТА, уводзіцца паняцце «час чакання», згодна з якім час ад званка да прыбыцця брыгады хуткай медыцынскай дапамогі па экстранным выкліку ў Мінску складзе 20 хвілін, а ў сельскай мясцовасці — 30 хвілін. Як расказаў галоўны ўрач Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Аляксандр ЖЫНКО, званкі ў хуткую медпамогу будуць дзяліцца на два тыпы: экстранныя і неадкладныя выпадкі.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіраўнік унутранай разведкі Францыі заявіў аб «замежным уплыве» на крызіс «жоўтых камізэлек»



Умяшальніцтва ў развіццё крызісу, звязанага з рухам «жоўтых камізэлек» у Францыі, вядзецца як унутры краіны, так і за яе межамі. Пра гэта заявіў кіраўнік Галоўнага ўпраўлення ўнутранай бяспекі (DGSI) Францыі Нікаля Лернер у інтэрв'ю газеце Le Parisien.

«Немагчыма адмаўляць, што некаторыя ў Францыі і за яе межамі зацікаўленыя ў тым, каб паставіць у цяжкае становішча ўрад і кіраўніка дзяржавы ў сувязі з рухам пратэсту «жоўтых камізэлек», памнажаючы фальшывыя навіны і распаўсюджваючы абсалютную хлусню. Падобнае ўмяшальніцтва непрымальнае», — адказаў ён на пытанне выдання пра тое, ці вядзецца ў яго службе расследаванне з нагоды ўмяшання Расіі ў гэты крызіс. У версіі інтэрв'ю, першапачаткова апублікаваным на сайце, Лернер удакладняў, што не каментуе расследаванні канкрэтна па Расіі, аднак пазней тэкст быў адрэдагаваны і гэта згадванне знікла.

## Кааліцыя з 16 штатаў падала іск супраць Трампа з-за сцяны на мяжы

У акруговы суд Сан-Францыска паступіў іск ад кааліцыі з 16 штатаў, паведамляе The New York Times. Істцы сцвярджаюць, што прэзідэнт не мае права сваім распараджэннем выдзяляць сродкі на будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай, паколькі выдаткі згодна з канстытуцыяй кантралюе Кангрэс.

Штаты звярнуліся ў суд, каб абараніць сваіх жыхароў, прыродныя рэсурсы і эканамічныя інтарэсы, гаворыцца ў іску.

«Насуперак волі Кангрэса прэзідэнт з прычыны крызісу незаконнай іміграцыі абвясціў надзвычайнае становішча ў краіне і вырашыў перанакіраваць федэральныя сродкі, выдзеленыя на барацьбу з наркотыкамі, ваеннае будаўніцтва і праваахоўныя органы для будаўніцтва сцяны на мяжы Злучаных Штатаў і Мексікі», — сцвярджаюць істцы.

Кааліцыю ў асноўным утварылі штаты, якія кантралююцца дэмакратамі. Атрымаўшы большасць у палаце прадстаўнікоў Кангрэса, яны заблакавалі ініцыятывы Трампа па будаўніцтве сцяны, хоць падчас прэзідэнцтва дэмакрата Барака Абамы не пярэчылі супраць выдзялення сродкаў для будаўніцтва агароджы на мяжы з Мексікай.

У лідарах аказаліся традыцыйна левыя Каліфорнія і Нью-Ёрк, да іх далучыліся Каларада, Канектыкут, Дэлавэр, Гаваі, Ілінойс, Мэн, Мэрыленд, Мічыган, Мінесота, Невада, Нью-Джэрсі, Нью-Мексіка, Арэгон і Вірджынія.

## Пілатуемы палёт на Марс можа адбыцца ў сярэдзіне 2030-х гадоў

Да гэтага часу вучоныя павінны паспець апрабаваць неабходныя для такога палёту тэхналогіі.

Паводле заявы дырэктара NASA Джыма Брайдэнстайна, падрабязную інфармацыю пра гісторыю і геалагічную будову Марса ўдалося атрымаць дзякуючы марсаходам Curiosity і Opportunity, а таксама станцыі Mars InSight.

Новыя даныя сведчаць аб тым, што на паверхні Марса маюцца складаныя арганічныя злучэнні, якія ўключаюць у сябе кампаненты для жыцця.

Да пачатку 2020 года NASA хоча даставіць на паверхню Марса яшчэ адзін апарат для збору інфармацыі. Менавіта ён дапаможа навукоўцам зразумець, ці было жыццё на Марсе ў далёкім мінулым, а таксама ацаніць магчымасць пражывання чалавека на гэтай планеце ў будучыні.

Армія

# ЖУРНАЛІСЦКАЙ ЗБРОЯЙ

**У калоннай зале Цэнтральнага Дома афіцэраў Узброеных Сіл узнагародзілі пераможцаў штогадовага творчага конкурсу, які праводзіць Міністэрства абароны. Мэта конкурсу — вызначыць найлепшае асвятленне ў сродках масавай інфармацыі пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл Беларусі, а таксама патрыятычнага выхавання насельніцтва.**

У цырымоніі ўзнагароджання прынялі ўдзел памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід Касінскі, першы намеснік міністра інфармацыі Павел Лёгкі.

Як адзначыў **Леанід Касінскі,** развіццё ў грамадстве пачуцця патрыятызму, выхаванне пачуцця адказнасці за абарону краіны з'яўляюцца прыярытэтнымі кірункамі забеспячэння ваеннай бяспекі.

**Павел Лёгкі** ў сваю чаргу падкрэсліў, што «мала быць прафесіяналам і пісаць пра армію цікава, тут трэба пісаць дакладна. Неяк Прэзідэнт параўнаў вынікі журналісцкай працы з магчымымі наступствамі прымянення зброі масавага паражэння. Сёння так і ёсць. Мы фарміруем грамадскае меркаванне, а ў сучасным свеце грамадская думка — гэта магутны сродак уздзеяння, зброя, інструмент уплыву. Безумоўна, фарміруючы стаўленне да войска, мы ствараем яго імідж у вачах мільёнаў грамадзян, тым самым падтрымліваючы нашы Узброеныя Сілы. Сёння дапамагаць арміі не толькі справай, але і словам як ніколі важна».



Фота БелТА.

**Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Аўтарскі погляд» стаў наш рэдактар аддзела Валяр'ян Шкленнік *(на фота)*. Віншуем калегу!**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗМАТВАЙ ВУДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але разам з тым рэкі Заходняя Дзвіна і Дняпро практычна па ўсёй даўжыні ўскрыліся. Нават там, дзе лёд на іх яшчэ захоўваецца, хадзіць вельмі небяспечна. Напрыклад, возьмем Гомельскую вобласць. Там размешчана пятнаццаць нашых станцый, на якіх штодзённа праводзяцца замеры. Толькі на вадаёмах у Хойніцкім і Кармянскім раёнах лёд на азёрах дасягае таўшчыні 18—20 сантыметраў. А вось на рэках Сож, Прыпяць, Дняпро і Іпуць абстаноўка вельмі складаная.

Небяспека тонкага лёду ў тым, што тэмпература вады пад ім толькі крыху большая за нуль. У такіх умовах у чалавека ёсць усяго пяць хвілін, каб выбрацца на паверхню. Калі прайшло больш часу, то шанцаў практычна няма. І нават знайсці цела тапельца для вадалаза не такая простая задача.

Нагадаем, што 11 лютага ў Столінскім раёне перакуліўся аэраглісер, на якім рабочы прыватнага прадпрыемства перавозіў на турыстычную базу па лёдзе дзесяць чалавек. Каля вёскі Семігосцічы лёд не вытрымаў, і глісер пацярпеў катастрофу. У вадзе аказаліся тры чалавекі. Адзін з іх патануў зараз жа, другога паспелі выцягнуць з вады, але ён памёр да прыезду машыны хуткай дапамогі. Трэці мужчына быў шпіталізаваны ў рэанімацыю. Цела ж ахвяры Прыпяці так і не знойдзена.

— Нашы вадалазы прайшлі ўжо больш за пяць кіламетраў па дне Прыпяці ў дастатковa складаных умовах, — адзначыў Анвар Ігамбердыеў. — Пошукі перакінуліся з раёна Давыд-Гарадка на тэрыторыю Гомельскай вобласці. Але цела небаракі пакуль не знойдзена.

Як вядома, бяспечная таўшчыня лёду складае не менш за сем сантыметраў, але і то ў выпадку, калі на покрыва выходзіць толькі адзін чалавек. Праўда, калі лёд сфармаваўся па ўсіх правілах. А надвор'е спрыяе гэтаму далёка не заўжды.

— Лёд у гэтым годзе фармаваўся вельмі своеасабліва, — згадвае **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на водах Фёдар КЛЮКАЧ.** — Снег змяняўся дажджом, ён, у сваю чаргу, слабамарозным надвор'ем... І вось цяпер, калі з-за цеплыні лёд істотна падтаяў, усё гэта і праяўляецца. Мы нарыхтоўвалі па просьбе супрацоўнікаў Батанічнага сада лёд для скульптур. Таўшчыня лёду, здавалася б, 30 сантыметраў. Але ў ім аказалася пяць праслоек! І паміж сабой яны злучаны вельмі нетрывала. Правaліца на такім лёдзе — працей простага. Таму мы звяртаемся да ўсіх кіраўнікоў прадпрыемстваў: правядзіце кароткія інструктажы з падначаленымі на тэму таго, што выходзіць на лёд надзвычай небяспечна.

Вось, здавалася б, на Мінскім моры лёд тоўсты. Але каля вёскі Лапаравічы мужчына вяртаўся дадому з рыбалкі і адной нагой праваліўся ў палонку. Аказалася, што пасля сябе рыбакі не пакінулі ніякіх папераджальных знакаў аб тым, што тут было бурэнне. Вось так чалавек на роўным месцы зламаў нагу. Добра, што вадалазы ратавальнай станцыі Заслаўе-1 робяць перыядычныя абходы мясцовасці. Яны яго заўважылі, аказалі першую медыцынскую дапамогу. Медыкі адзначылі, што гэта было зроблена вельмі кваліфікавана.

У найбліжэйшыя дні крыху падмарозіць, але чакаецца і даволі моцны вецер з парывамі да 15—20 метраў за секунду.

— Кажучы па праўдзе, гэта яшчэ горш, чым простае таянне лёду. Калі пад сонцам ён хаця б папераджальна чарнее, то моцны вецер пры слабаадмоўнай тэмпературы паветра адшліфуе верхнюю частку покрыва, стварыўшы ілюзію, што тут хадзіць бяспечна. Таму пра прагулкі па лёдзе пакуль лепш забыць.

Як толькі вадаёмы вызваляюцца ад ледзянога покрыва, на лодках пачынаюць выходзіць рыбакі. Вось толькі і такая рыбалка можа прывесці да трагедыі. Перагруз судна, няправільна выбранае становішча — і лодка перакульваецца. А калі яшчэ і няма ратавальнай камізэлькі...

— Летась на маламерных суднах загінула 11 чалавек, у тым ліку дзіця, — кажа **начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных судах Міхаіл ЧАШУН.** — Рыбакі ж яшчэ і блытаюцца ў сетках. Сітуацыю пагаршае тое, што трагедыі з імі адбываюцца пераважна ў начны час сутак, калі на дапамогу не прыйдзе элементарна ніхто. Яшчэ адметна, што 80 % загінулых былі нецвярозымі.

Як зазначае **начальнік аддзела гідралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Алена ЗУБЧОНАК,** надвор'е ў найбліжэйшы час будзе спрыяць павольнаму раставанню покрыва. Але штодня інфармацыя аб стане лёду на рэках і азёрах размяшчаецца на сайтах Белгідрамета, на старонках у сацсетках. Таму даведацца аб рэальным стане падзей няцяжка, дастаткова толькі мець доступ да сеціва.

Тым часам па стане на 18 лютага ў Беларусі ўжо патанула пяць чалавек. Яшчэ сем удалося выратаваць. Напрыклад, летась за гэты час вада забрала 14 жыццяў, сярод іх былі два дзіцячыя.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# НЕ ЧАПАЙ, БО ЛЯСНЕ

**Мужчына праігнараваў папераджальныя знакі і рыбачыў непасрэдна пад высакавольтнай лініяй. Яго ўдарыла токам. Работнікі электрасетак выехалі на агляд пасля паведамлення аб адключэнні 110-кілавольтнай лініі. Пры абыходзе была знойдзена абгарэлая вуда... Паводле інфармацыі відавочцаў, мужчына рыбачыў, знаходзячыся пад лініяй. У адзін момант ён зачапіў высакавольтны провад вудай. Пацярпелага даставілі ў рэанімацыю...**

Летась на аб'ектах энергетычнага нагляду адбылося 20 няшчасных выпадкаў у выніку паражэння электрычным токам, паведаміў галоўны дзяржаўны інспектар краіны па энергетычным наглядзе — **начальнік аддзела Дзяржаўнага энергетычнага і газавага нагляду і аховы працы Мінэнерга Максім ГЕРМАН.**

Усяго пацярпела 20 чалавек, з іх 11 загінула. Самае сумнае тут заключаецца ў тым, што восем загінулых ад электрычнасці людзей былі рыбакамі.

А месца рыбалкі трэба выбіраць не бліжэй чым за 100 метраў ад высакавольтнай лініі электраперадачы, нагадаў **начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела ДВА «Белэнерга» Аляксандр МАЛЬКОЎ.** Паводле яго слоў, самая галоўная небяспека, якую не разумеюць сучасныя рыбакі, заключаецца ў тым, што вуглепластыкавыя вуды фактычна ўяўляюць сабой доўгі жалезны прут, які вельмі добра праводзіць ток.

«У гэтым галоўнае адрозненне вуглепластыкавых вуд ад шклапластыкавых, якія былі проста ідэальнымі ізалятарамі. Цяпер на кожнай вудзе ёсць знак — перакрэсленая ЛЭП, у крамах выдаюцца памяткі, ёсць сацыяльная рэклама на гэтую тэму», — расказаў Аляксандр Малькоў. Атрымаць моцны ўдар токам можна, нават калі вы не закранулі вудзільнам правадоў, а проста наблізіліся да іх на недапушчальную адлегласць, таму выбіраць месца для рыбалкі трэба не менш чым за 100 метраў ад ЛЭП.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ...

## ...Айчынныя тэлеканалы прадставяць спецыяльныя праекты

**Ужо традыцыйна 21 лютага праграма «Наша раніца», прагноз надвор'я і ўсе выпускі навін на АНТ выйдуць на беларускай мове. Таксама да святкавання сёлета далучыцца сайт тэлеканала, афіцыйныя акаўнты ў сацсетках і радыёстанцыя «Цэнтр FM».**

«Раніцай чацвярга пагаворым пра самыя запатрабаваныя і рэдкія мовы свету, — анансуе кіраўнік дырэкцыі ранішняга вяшчання АНТ Таццяна Рудакоўская, — і пра тое, як важна іх вывучаць. Раскажам пра паліглотаў, паразважаем, чаму адным людзям лёгка даецца вывучэнне замежнай, а другім — складана». Дарэчы, нагадваюць прадстаўнікі Агульнанацыянальнага тэлебачання, штомесяц адзін з выпускаў праграмы «Наша раніца» выходзіць цалкам па-беларуску.

Адмысловыя праграмы прадставяць у Міжнародны дзень роднай мовы тэле- і радыёканалы, якія ўваходзяць у склад Белтэлерадыёкампаніі. Так, Агенцтва тэленавін на **«Беларусь 1»** пакажа, якая мілагучная і прыгожая наша мова, у відэаролiку, галоўнай тэмай якога стала песня «Мой родны кут» на словы Якуба Коласа. На тэлеканале **«Беларусь 3»** згадаюць літаратурную класіку — любімыя вершы знакамітых беларускіх паэтаў прачытаюць як вядомыя дзеячы культуры, так і цяперашнія студэнты. А ў эфіры **радыё «Сталіца»** пад дэвізам «Наша мова — для размовы!» кожную гадзіну будуць гучаць яркія літаратурныя выступленні айчынных рок-зорак — Naviband, Akute, Re1ikt, «Палац», NIZKIZ ды іншых.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ...у БДЭУ напішуць дыктоўку

**21 лютага ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце адзначаць Міжнародны дзень роднай мовы. Традыцыйна да гэтага дня ў ВНУ прымеркаваныя выстаўкі і конкурсы. Студэнты запісваюць тэматычныя эфіры на беларускай мове для ўніверсітэцкага радыё. Аднак галоўнае мерапрыемства — агульнаўніверсітэцкая беларуская дыктоўка.**

Летась удзел у яе напісанні ўзяло больш за 200 чалавек: сярод іх былі не толькі студэнты, але і выкладчыкі і члены рэктарата, прафесійная дзейнасць якіх не звязаная з выкладаннем моў. Не абмінулі ўвагай мерапрыемства. Сёлета ўніверсітэт запрасіў ганаровага госця — народную артыстку Беларусі, актрысу Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Таццяну Мархель. Яна будзе агучваць удзельнікам тэкст дыктоўкі. Нягледзячы на тое, што БДЭУ не з'яўляецца профільным лінгвістычным універсітэтам, мерапрыемствы моўнай скіраванасці тут праходзяць даволі часта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Акцыя

# Упершыню пройдзе «Адзіны дзень бяспекі»

**Акцыя працягнецца з 20 лютага да 1 сакавіка. У гэтыя дні адбудуцца мэтанакіраваныя прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджанні надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў і злачынстваў, а таксама навучанне паводзінам ва ўмовах пажараў, аварый, аказанню першай медыцынскай дапамогі, паведамілі ў МУС.**

У перыяд правядзення акцыі адбудуцца вучэнні і трэніроўкі па рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі прыроднага і тэхнагеннага характару на выбуха-, пажара-, хімічна небяспечных аб'ектах, аб'ектах з масавым знаходжаннем людзей. Запланаваны праверкі сістэмы апавяшчэння ў тым ліку праз СМС, трансляцыя паведамленняў ад МНС у тэлевізійным і радыёэфіры. Розныя ўстановы адпрацуюць бяспеку правядзення эвакуацыі са сваіх будынкаў.

У рамках «Адзінага дня бяспекі» будуць арганізаваны квэсты «Формула бяспекі», інтэлектуальныя гульні «Бяспечны сусед», навучальныя пляцоўкі «Пяць крокаў выратавання», пройдуць конкурсы на найлепшую творчую работу, прысвечаную пытанням бяспечнай жыццядзейнасці, тэматычныя канцэртныя праграмы і тэатралізаваныя імпрэзы. У структурных падраздзяленнях розных ведамстваў пройдуць дні адчыненых дзвярэй.

Акрамя органаў дзяржаўнага кіравання (Генпракуратура, МНС, МУС, Мінэнерга, Міністэрства аховы здароўя, Мінадукацыі, Мінпрацы і сацабароны, Мінжылкамгас, Мінкультуры) і мясцовых органаў улады, удзел у акцыі прымуць розныя арганізацыі і грамадскія аб'яднанні: Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, РДГА «Беларускае добраахвотнае пажарнае таварыства», Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа, РДГА «Таварыства ратавання на водах», РГА «Белая Русь» і ГА «БРСМ».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ ПРА АДКАЗНАСЦЬ

## Што такое Дэкрэт № 18 і як ён працуе?

**На жаль, здараюцца сітуацыі, калі дзеці не знаходзяцца ў бяспецы. Гэта адбываецца ў тым ліку таму, што іх галоўныя абаронцы — бацькі — не гатовыя або не здольныя несці адказнасць за іх. Як дзяржава абараніла такіх дзяцей? Прэзідэнт прыняў Дэкрэт ад 24 лістапада 2006 года № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях». Што ён сабой уяўляе?**

Па факце гэты дакумент забяспечвае абарону правоў і законных інтарэсаў дзяцей у такіх сем'ях, а таксама павышае адказнасць бацькоў, якія не выконваюць канстытуцыйныя абавязкі па выхаванні сваіх дзяцей.

У дэкрэце падрабязна выкладзена працэдура адабрання дзяцей з неўладкаваных сем'яў. Падымаецца пытанне адказнасці асоб, якія ўхіляюцца ад утрымання сваіх дзяцей, а таксама пытанне працаўладкавання такіх бацькоў.

Акрамя таго, у дакуменце сказана аб рэалізацыі маёмасці і здачы ўнаём жылля для пакрыцця выдаткаў дзяржавы на ўтрыманне дзіцяці.

Разбяром асноўныя паняцці. Нядобрасумленныя бацькі — гэта людзі, якія вядуць амаральны лад жыцця, з'яўляюцца хранічнымі алкаголікамі ці наркаманамі альбо іншым чынам неналежна выконваюць свае абавязкі па выхаванні і ўтрыманні дзяцей, у сувязі з чым апошнія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Сацыяльна небяспечнае становішча — гэта шкоднае ўздзеянне на дзіця вышэйназваных бацькоў.

Хто прымае рашэнне аб тым, што дзіця мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне? Пры наяўнасці падстаў гэта робіць камісія па справах непаўналетніх, пасля чаго бацькам паведамляе пракурор.

Далей у камісіі ў паўгадавы тэрмін ёсць два варыянты вырашэння сітуацыі: альбо вярнуць дзіця бацькам — калі праблемы вырашаны (бацька (або маці) працаўладкаваўся, гасіць даўгі, кідае шкодныя звычкі, змяняе стаўленне да сына ці дачкі), альбо пазбавіць іх бацькоўскіх правоў.

Важна, што выдаткі па ўтрыманні дзяцей дзяржавай кампенсуюць самі нядобрасумленныя бацькі. Калі іх заробак не дазваляе кампенсаваць расходы, іх працаўладкоўваюць па пастанове суда. Выключэнне — недзеяздольныя бацькі і тыя, хто не можа выконваць бацькоўскія абавязкі па стане здароўя згодна з зацверджаным пералікам захворванняў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ВЫРАТАВАЦЬ ДЗЯЦІНСТВА

Адкуль і з чаго гэта пайшло — сацыяльнае сіроцтва ў нашым грамадстве, сказаць цяжка. Калі я ў 90-х пачынала пісаць на гэтую тэму, то часта сустракала горкае параўнанне: пасля вайны дзіцячыя дамы напаўнялі сапраўдныя сіроты — бацькі якіх загінулі, а цяпер гэта дзеці, якіх бацькі кінулі. Тады, у 90-х, у інтэрнатных установах выхоўвалася 35 тысяч дзяцей, у асноўным гэта былі так званыя сацыяльныя сіроты. Але гэта не значыць, што дзяцей, якія пакутавалі з-за таго, што бацькі пра іх забывалі за пляшкай гарэлкі, было столькі. Нацыянальная сістэма па своечасовым знаходжанні малых, якія аказаліся ў небяспечным жыццёвым становішчы, яшчэ толькі выбудоўвалася. Часам непаўналетніх забіралі з сям'і толькі пасля таго, як з кімсьці з іх або з бацькоў здаралася бяда. Напрыклад, у 1993 годзе «Звязда» пісала пра сям'ю, дзе шасцёра дзяцей забралі ад бацькоў пасля таго, як пры нявысветленых абставінах загінула сёмае. Малодшаму з іх было 8 месяцаў, старэйшаму — 14 гадоў. Пакуль дзяцей афармлялі ў інтэрнатныя ўстановы, бацькі прадалі чатырохпакаёвую кватэру ў цэнтры Мінска, а выручаныя грошы хутка прапілі. Пасля прыняцця Дэкрэта № 18 наўрад ці такі жыццёвы сцэнарый быў бы магчымы. Хутчэй за ўсё, сёмае дзіця засталося б жывым. Не выключана, што бацькі паспрабавалі б вярнуць сваіх сыноў і дачок.

На пачатак мінулага года ў нашай краіне налічвалася 20,8 тысячы дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. Міністэрства адукацыі адзначае, што з прыняццем Дэкрэта № 18 іх колькасць паступова скарачаецца. За апошнія пяць гадоў узровень сацыяльнага сіроцтва знізіўся на 16 працэнтаў.

На жаль, штогод у нашай дзяржаве рэгіструецца новая колькасць дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Летась такіх было 2322.

Безумоўна, пільная ўвага дзяржаўных органаў, якія абавязаны своечасова выяўляць непаўналетніх у складанай жыццёвай сітуацыі і папярэджваць сямейныя катастрофы, дапамагае знізіць колькасць няшчасных выпадкаў, звязаных з малымі. Аднак своечасовае выяўленне небяспечнай сітуацыі цяжка стасуецца з памкненнем скараціць колькасць адабраных дзяцей. Таму вельмі складана мераць эфектыўнасць дэкрэта нейкім адным паказчыкам. Як вельмі цяжка прымусіць залежнага чалавека перамагчы сваю залежнасць. Таму, хто разбурае сябе, надзвычай цяжка знайсці сілы выратоўваць сваю сям'ю. І ўсё ж такі, дэкрэт працуе. Людзі вяртаюць дзяржаве грошы і вяртаюць дзяцей.

На пачатак гэтага года міжведамасная работа па ліквідацыі сацыяльна небяспечнага становішча праводзілася ў 13 288 сем'ях, дзе выхоўвалася 24 691 дзіця. Зняты з уліку ў сувязі з нармалізацыяй абстаноўкі 20 595 дзяцей з 10 205 сем'яў.

За мінулы год 2904 дзіцяці атрымалі статус тых, хто мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне. 1756 дзяцей вернуты бацькам, бацькі 1146 дзяцей не зрабілі захадаў па стабілізацыі сітуацыі ў сям'і, адносна іх суд будзе прымаць рашэнне аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў.

На пачатак гэтага года ў дачыненні да 18 862 дзяцей бацькі кампенсуюць расходы дзяржаве па іх утрыманні. За 2018 год кампенсавана 63,35 % сродкаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# СТРАШНА БЫЦЬ СВАЙМУ


Юная мастачка Ліза.

## Незвычайная «нармальная» сям'я

— Нейкі час мне здавалася, што наша сям'я звычайная. І сапраўды, такіх сем'яў было шмат. У той час мы з бацькамі жылі з бабуляй. Бацька патроху выпіваў, але працаваў. Маці не піла. Праблемы пачаліся, калі мы пераехалі ў асобную кватэру. Маці таксама стала выпіваць... Мне было гадоў сем, калі я ўбачыла першую бойку паміж бацькамі. Я тады напалохалася, але хутка прызвычаілася да новых абставін.

Мне вельмі ўрэзалася ў памяць, як забіралі дзяцей нашых суседзяў. Мы разумелі, што так трэба. Бруд, смецце, тараканы, голад... У тых умовах дзеці не маглі выжыць, таму здавалася натуральным, што ў суседзяў іх забралі. У параўнанні з імі мы лічыліся «нармальнымі». Бацькі працавалі і кармілі мяне з сястрой. Так і раслі. У дзявятым класе трэба было вырашаць як жыць далей. Усе аднакласнікі рыхтаваліся да выпускнога: абмяркоўвалі планы на будучыню, а дзяўчынкі з трапятаннем выбіралі сукенкі. І мне хацелася. Але! Калі я прыйшла з гэтым пытаннем да бацькоў, тата мне сказаў: «Які выпускны, якая сукенка! Я ў твае гады працаваў ужо!»

Мне было пятнаццаць, і я была даволі імпульсіўнай дзяўчынкай. Ляснула дзвярыма і пабегла да сяброўкі. Яна аказалася ў такім жа становішчы. Мы былі адзіныя ў класе, хто прыйшоў на выпускны ў падраных джынсах. Трэба было шукаць работу. Але для падлеткаў гэта не так проста. Усё ж мы знайшлі занятак на рынку. Канешне, маці настаяла, каб я падала дакументы ў ПТВ. Я так і зрабіла.


Стол будучай першакласніцы.

Але вучыцца не пайшла. Я проста не разумела, навошта. Мне вельмі добра плацілі. Кожны дзень. Мне хапала на добрае адзенне, добрыя прадукты, касметыку, яшчэ і заставаліся грошы, каб пагуляць. Ну навошта ісці «мазгі сушыць», калі ўсё добра? Адпрацаваў дзень, атрымаў грошы, набыў сабе сукенку, якая падабаецца. А потым піва — і наперад, на дыскатэку танчыць. Я стала незалежнай ад бацькоў. З'явілася шмат новых знаёмых і новая кампанія, якія жылі менавіта так. І я хацела жыць так. У хуткім часе мне стала мала піва. Спачатку пачала выпіваць віно, а потым разам з калегамі і гарэлку. Праз некалькі гадоў такога жыцця не адразу, але заўважыла, што мне лягчэй працаваць, калі я пахмялюся. З раніцы невыносна балела галава, здавалася, што паміраю. Кожны гук выклікаў боль і невыноснае раздражненне. А трошкі вып'еш — і ўжо адчуваеш сябе добра. Я не задумвалася аб тым, што са мной адбываецца нешта ненармальнае. Усе мае сябры гэтак жа пахмяляліся і жылі далей. Ды што сябры — усё маё акружэнне жыло так.

## «Не магла глядзець у вочы дачцэ...»

Потым упершыню закахалася сур'ёзна. Гэта было падобна на вар'яцтва. Прайшло ўжо шмат гадоў, і я не разумею, чаму пакахала таго чалавека. У нас была адна кампанія, падобныя сем'і, і мы абодва былі безадказныя. Маці на мяне сварылася за тыя адносіны, бо бачыла, што яны пустыя. Але я нікога не хацела слухаць і вырашыла нарадзіць дзіця ад гэтага мужчыны. Калі я зацяжарала, то перастала піць. Не памятаю, каб гэта было цяжка. Проста перастала і ўсё. У 2004 годзе нарадзілася мая старэйшая дачка Люба. Трымала малую на руках і разумела: я мама. Але як толькі прыехала дамоў.... Божа, дзе былі мае мазгі? Я любіла і люблю Любу, але магла сысці на некалькі дзён і пакінуць дачку на бацькоў. Зноў пачала выпіваць, гуляць з сябрамі. З бацькам Любы рассталіся, калі дачцэ было тры месяцы. Ды мы і не жылі ніколі разам, толькі начавалі адно ў адным. Люба расла добрай дзяўчынкай, спакойнай і разважлівай. Калі малой споўнілася тры гады, я ўладкавалася на работу дворнікам у ЖЭСе. Зноў выпівала. І мяне пачалі папярэджваць аб тым, што я магу страціць дзіця... А мне ніяк не ўдавалася гэта асэнсаваць. Не тое, што я не разумела... Проста не магла ўсвядоміць. Са мной размаўлялі выхавацелька, загадчыца дзіцячага садка, участковы... Я памятаю першае пасяджэнне камісіі па справах непаўналетніх. Іду туды і не разумею, чаму яны мяне выклікалі... Прыходжу — а там шмат людзей. Усе крычаць і сарамяць мяне. А мне галава баліць. Паслала я ўсіх ды сышла. Я не магу сказаць, дзе і калі першы раз забралі ад мяне Любу. Ёй на той момант споўнілася ўжо чатыры з паловай гады. І гэта быў сапраўдны шок. Мне маці кажа: «Люба ў СПЦ, табе трэба ісці туды», а я не магу зразумець, чаму ў мяне дзіця забралі. Як гэта? Я ж памятаю дзяцінства! Забіралі ў самых апошніх алкаголікаў, а я ж працую, я ж не алкаголік! І сорам, жудасны сорам. У СПЦ я, канешне, прыйшла, але да Любы ў групу не заходзіла... Я не магла глядзець сваёй дачцэ ў вочы. Са мной працавалі псіхолагі, яны тлумачылі, што дзіця мяне чакае, пытаецца, дзе я. А я не магла, не магла! Калі ўсё ж асмелілася... Мы з ёй доўга размаўлялі. Я вырашыла, што зраблю ўсё, каб забраць сваю малую з прытулку. Закадзіравалася, працавала, збірала ўсе неабходныя дакументы, выконвала ўсе ўмовы спецыялістаў. І, нарэшце, забрала. Мы ўсе чакалі гэтага дня: я, мае бацькі, мая сястра, якая ўжо

**«Памятаю першае пасяджэнне камісіі па справах непаўналетніх. Прыходжу — а там шмат людзей. Усе крычаць і сарамяць мяне. А мне галава баліць. Паслала я ўсіх ды сышла».**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «НЕ АБАВЯЗАНАЙ» ДЗІЦЯЦІ

гадавала сваю дачку, і, канешне, Люба. Аднак гэта аказаўся вельмі цяжкі і напружаны момант. Памятаю, едзем дадому з дачкой і маўчым нацягнутыя, як струны. Я была вельмі пакрыўджаная тады. Мне здавалася, нібыта за мной усе сочаць і чакаюць маіх памылак. Прывяла малую ў сад, а там нас і не чакалі. Сустрэлі бязрадасна і пры гэтым кінулі ў спіну: гэта ненадоўга. Паехала да ўчастковага, той таксама «падтрымаў»: маўляў, усё роўна твая малая вернецца туды, дзе была... Я злавалася на ўсіх і ненавідзела за тое, што мяне не разумеюць. І цягнулася да тых старых знаёмых, якія «падтрымлівалі» мяне, як здавалася, па-сапраўднаму.

Карацей, пратрымалася нядоўга. Спачатку выпіла трошкі, каб расслабіцца... І ўсё. Разумела, што калі мяне ўбачаць у такім стане ў садку, адразу адбяруць Любу. Таму ўзяла невялічкі водпуск на рабоце і паехала ў вёску. А там... чатыры дні піла. Ехаць назад было яшчэ больш страшна. Але вярнулася. Не прайшло і пяці хвілін, як у кватэру пазванілі. Гавару Любе: «Не адчыняй». Але малая радасна пабегла да дзвярэй. А далей: чужыя людзі ў доме, крык, слёзы, Люба хапаецца за дзеда, яе адрываюць і ўвозяць. Мой свет разбурыўся...

Далей усё было як у сне. Зноў СПЦ, вельмі хутка суд. Мяне пазбавілі бацькоўскіх правоў, перасталі пускаць да Любы і адправілі ў лячэбна-працоўны прафілакторый. У мяне не было сіл супраціўляцца, адчувала нейкую невыносную пустэчу і бездапаможнасць. Я змірылася. Там, у ЛПП, даведалася, што я больш «не абавязаная». Гэта быў кантрольны выстрал. Страшна быць больш «не абавязанай» свайму ўласнаму дзіцяці... Маю дачку ўдачарылі.

## Больш не гатова рызыкаваць

Калі вярнулася з ЛПП, мяне ўжо ніхто не чакаў, я нікому не была патрэбна. Адразу пачала піць. Праз некаторы час мяне сустрэў участковы і адразу склаў пратакол. Потым другі, трэці... Чацвёрты пратакол азначаў паўторную адпраўку ў ЛПП. Я не гатова была туды вяртацца. Паспрабавала наладзіць жыццё. Палюбіла мужчыну, Аляксея, стала сустракацца з ім. Зацяжарала... Неўзабаве аб гэтым даведаўся ўчастковы. Ён так крычаў на мяне — не перадаць. Мне нават смешна стала: маўляў, як гэта я пасмела зацяжараць без яго дазволу. Мяне сталі кантраляваць. У хуткім часе сышла ў дэкрэт. На той момант мяне турбавалі адносіны з бацькам дзіцяці, бо хацелася мець нармальную сям'ю. Аляксей здрадзіў мне, я пакутавала, але піць не пачынала. Нарадзіла дачку Лізу. Гэта малая зрабіла мяне шчаслівай. Я карміла яе сваім малаком амаль да двух гадоў. Дачка вяртала мяне да жыцця. Адначасова старалася наладзіць добрыя адносіны з яе бацькам. Але пасля яго чарговай здрады, нягледзячы на тое што ў мяне быў даволі вялікі перапынак ва ўжыванні алкаголю, набыла сабе бутэльку шампанскага і пайшла піць дадому. Без кампаніі. Каб дачка нічога не бачыла, адвяла яе да сваёй знаёмай. Але ж менавіта ў гэты дзень органы апекі прыехалі па дзяцей той жанчыны. І, канешне, забралі маю Лізу... З жахам успамінаю той момант. Я, задаволеная ад выпітага шампанскага, іду зноў да крамы. І раптам да мяне падбягае мая маці і крычыць на мяне. Яе словы даходзілі з цяжкасцю. Я зразумела, што Лізу павезлі ў СПЦ, але ўсё ўнутры адмаўлялася прымаць гэта. Моўчкі набыла гарэлку і сышла. Ачуняла праз некалькі дзён. Трэба было ісці ў прытулак. Калі пад'ехала на машыне са знаёмым, убачыла, як выхавацелька гуляе з маёй дзяўчынкай. Ледзь не звар'яцела на месцы. Здавалася, што бачу адразу дзвюх: Любу і Лізу... Я не магла яе страціць.

Я гатова была зрабіць усё, каб мне вярнулі дачку. Аляксей, бацька Лізы, на камісіі мяне зневажаў, гаварыў, што не даглядала дзіця, кідала адну і не карміла... Мне паставілі ўмову, каб памірылася з бацькам Лізы. Я зноў закадзіравалася, выйшла на работу, спрабавала наладзіць адносіны з Аляксеем. Што заўгодна была гатова цярпець ад яго і цярпела. Чакала, калі змагу забраць дачку дадому. У той дзень мы павіны былі прыйсці на камісію ўдваіх: я і бацька Лізы. Але ён не прыйшоў. Яго чакалі некалькі гадзін, якія для мяне здаліся вечнасцю. Я не вытрымала і пачала крычаць. Божухна, як я крычала!.. Добра, што там былі супрацоўнікі СПЦ, якія ведалі, што значыць для мяне Ліза, і ўступіліся за мяне... Мне вярнулі дачку. Не адразу пайшло ўсё гладка. Былі вельмі няпростыя моманты ў жыцці. З бацькам Лізы я рассталася. Праўда, зрэдку ён прыходзіў да нас скандаліць. Але я больш не гатова рызыкаваць дачкой. Нядаўна бацьку Лізы забралі ў ЛПП, нам стала больш спакойна.

### Пасляслоўе

Ведаю, што я алкаголік. Мне нельга нават грам выпіць — небяспечна. Сёння я трымаюся. Доўгі час здавалася, што ўвесь свет супраць мяне, што да мяне ставяцца несправядліва... Крыўдзілася, нават на ўрачоў. Было, што пасля доўгай «завязкі» выпівала, і мне станавілася так дрэнна, што прыходзілася выклікаць хуткую. Але калі ўрачы бачылі мяне скурчаную, без зубоў і з невыносным перагарам, разводзілі рукамі: маўляў, мы тут нічым не дапаможам... Было, што мне кідалі ўслед брыдкія словы і ставіліся да мяне як да чалавека нізкага сорту. Я пакуль не магу растлумачыць тыя свае неадэкватныя ўчынкі. Мне ніхто не перашкаджаў самой звярнуцца па дапамогу да псіхолагаў. Я проста была вымушана з імі працаваць, і мне пашанцавала, што яны ўсё ж паступова дастукаліся да мяне. Зараз я дзіўлюся, чаму не гаварыла аб нейкіх сваіх перажываннях са спецыялістамі. Я нібыта хавалася, была закрытая ад іх. Калі стала паступова адкрывацца, яны змаглі ўбачыць, як мне дапамагчы. Я вельмі ўдзячная ім за цярпенне — яны былі са мной усе гэтыя гады.

**«У ЛПП даведалася, што я больш «не абавязаная». Гэта быў кантрольны выстрал. Страшна быць больш «не абавязанай» свайму ўласнаму дзіцяці... Маю дачку ўдачарылі».**


Ліза выбірае сукенку для прагулкі.

Сярод міліцыянераў таксама былі тыя, каму раптам станавілася шкада мяне, і яны заступаліся за мяне перад калегамі. І міласэрнасць з іх боку да мяне была гаючай.

У мяне з'явіліся новыя сябры, сапраўдныя, якія падтрымлівалі мяне не бутэлькай, а сваім сяброўствам.

Але ў сэрцы засталася рана, якая не загойваецца. Я страціла Любу. У хуткім часе мая малодшая дачка будзе святкаваць першы выпускны, і я буду глядзець, як Ліза развітваецца з дзіцячым садком. Аднак я не была побач у такі момант са сваёй старэйшай дачкой.

Хутка павяду Лізу ў першы клас, і мы разам будзем хваляваცца. Але ніколі не ўбачу, як пайшла ў школу мая старэйшая дачка... І гэта трагедыя нашай маленькай сям'і. Веру, што Любу робяць шчаслівай новыя бацькі. І спадзяюся, што лёс дасць калі-небудзь мне магчымасць папрасіць у яе прабачэння.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

**P. S. Прозвішча гераіні не ўказана з этычных меркаванняў.**

## Кампетэнтны каментарый

# Асноўная задача — захаваць біялагічную сям'ю

**«Звязда» звярнулася па каментарыі аб рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях» да старшынь профільных камісій абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Беларусі.**



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА:**

— Прызнанне таго, што дзіця знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы — гэта жаданне і неабходнасць дапамагчы сям'і. Увесь механізм пакрокава распісаны ў заканадаўстве і ў метадычных рэкамендацыях. Усё праходзіць планава і паступальна, каб бацькі ўсвядомілі, што губляюць самае дарагое, і пры гэтым не траўмаваць дзіця. Асноўная задача дзяржавы — захаваць яго ў роднай сям'і. Таму так важна працаваць на апярэджанне і прафілактыку.

25 гадоў таму нядбайных бацькоў пазбаўлялі бацькоўскіх правоў, а дзяцей аддавалі на дзяржзабеспячэнне. Такой карпатлівай работы з сямейнай неўладкаванасцю не было. І практыкі аднаўлення ў бацькоўскіх правах не было. З прыняццем Дэкрэта № 18 многія бацькі вырашылі вярнуць свае правы. І за 12 гадоў яго існавання больш за дзве тысячы чалавек адноўлены ў бацькоўскіх правах у дачыненні да 3,3 тысячы дзяцей.

Хацелася б падкрэсліць, што акрамя Дэкрэта № 18 пытанні абароны правоў і інтарэсаў дзяцей, сямейных праваадносін, процідзеяння гвалту ў сям'і рэгулююцца таксама Кодэксам аб шлюбе і сям'і, законамі Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці», «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў», Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях. Створана прававая аснова для забеспячэння недатыкальнасці асобы дзіцяці, яго абароны ад гвалту ў сям'і, вызначаны механізмы дзяржаўнай абароны ў выпадку знаходжання дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы. Але прыклады паводзін бацькоў сведчаць аб тым, што для нашага грамадства гэтая праблема яшчэ застаецца вострай. Значыць, патрэбны меры як па кансалідацыі намаганняў усіх зацікаўленых, так і па павышэнні эфектыўнасці прафілактычнай работы.



**Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па працы і сацыяльных пытаннях:**

— Актуальнасць гэтага нарматыўнага прававога акта бясспрэчна была як на момант яго выдання, так і зараз. Сацыяльнае сіроцтва — гэта боль і бяда нашага грамадства. Барацьба з ім і ліквідацыя яго прычын з'яўляецца ў цяперашні час прыярытэтнай задачай, якую неабходна вырашаць супольна, прыцягваючы ўсе органы ўлады і грамадскія інстытуты.

У свой час у працэсе распрацоўкі Дэкрэта № 18 было шмат скептыкаў. І гэта зразумела. Задача пераадолення сацыяльнага сіроцтва стаіць перад многімі краінамі. Беларусь сёння знаходзіцца ў авангардзе рашэння гэтай няпростай задачы. Краіна пайшла па шляху, аналагаў якому ў свеце няма. Быць піянерам у любой справе заўсёды вельмі складана.

Вельмі часта на практыцы работа па рэалізацыі Дэкрэта № 18 праводзіцца па двух напрамках — прафілактыка сацыяльнага сіроцтва і кампенсацыя грашовых сродкаў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржзабеспячэнні. Гэта, безумоўна, вельмі важна, але тут, я падкрэсліваю, у аснову пастаўлены пытанні рэабілітацыі і ўз'яднання біялагічнай сям'і.

Дзеці не павінны пакутаваць ад таго, што іх бацькі безадказна ставяцца да сваіх абавязкаў, вядуць амаральны лад жыцця. Ні адно дзіця, якое трапіла ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, не павінна быць пакінутае без увагі.

Усе мы ўсведамляем, што толькі здаровая, моцная сям'я, маральна і фізічна развітыя, псіхалагічна ўстойлівыя, сацыяльна адаптаваныя, уключаныя ў нармальнае жыццё дзеці — гэта гарант стабільнага і паспяховага развіцця грамадства і будучыні нацыі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Надзея АНІСОВІЧ.**

## У тэму

Трывожныя сігналы аб тым, што сітуацыя ў доме і сям'і неспрыяльная, могуць заўважыць супрацоўнікі розных органаў і арганізацый падчас выканання сваіх прамых абавязкаў. Як растлумачыла галоўны пазаштатны спецыяліст **Міністэрства аховы здароўя па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе дзецям Ганна КОТАВА**, медыкі падчас аказання дапамогі дома, выкананні патранажнай работы павінны звяртаць увагу на выпадкі, калі бацькі сістэматычна не выконваюць рэкамендацыі па дыягностыцы, лячэнні, рэабілітацыі дзіцяці, што пагражае яго жыццю і здароўю. Але работнікі аховы здароўя абмежаваныя рамкамі сваёй прафесійнай дзейнасці. Таксама ўрача-спецыяліста, участковага ўрача могуць прыцягваць у ролі эксперта, каб вызначаць наяўнасць пагрозы жыццю і здароўю дзіцяці.

**Як паведаміў «Звяздзе» намеснік начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Алег МАКСІМАЎ**, на 1 студзеня 2019 года на ўліку ў органах унутраных спраў знаходзілася 11 375 абавязаных асоб, гэта на 171 чалавека менш, чым год таму. З іх не працаўладкавана 227, ухіляюцца ад работы на прадпрыемствах 2845 (на 1672 чалавек больш, чым годам раней). Пад ухіленнем разумеецца адсутнасць на рабоце на працягу рабочага дня без уважлівай прычыны.

Пастаўлена на ўлік у органы ўнутраных спраў абавязаных асоб, у дачыненні да якіх атрыманы прысуды, рашэнні суда, — 5405.

За 12 месяцаў 2018 года ў органах унутраных спраў вышукваліся 1103 даўжнікі і адказчыкі па исках і выканаўчых дакументах аб спагнанні расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Адшукана, з улікам мінулых гадоў, 1101. На пачатак бягучага года заставалася ў вышуку 266.

## Святы

# «Дала мне маці гэту мову...»

**«Вы ўвесь час гаворыце па-беларуску?» — часта пытаюць у мяне, і я тады таксама пытаю: «А чаму вас здзіўляе, што беларуска ў Беларусі...»**

А зрэшты, гэта сапраўды дзіва, якое ў адных выклікае шчырае захапленне і жаданне падтрымаць дыялог на роднай мове, а другіх — наадварот, бянтэжыць ці нават раздражняе.

Я не збіраюся тут заклікаць суайчыннікаў да ўсведамлення сябе беларусамі. Пра гэта і напісана, і сказана нямала. Проста напярэдадні Дня роднай мовы хачу падзяліцца тым, што на душы.

Вясковая школа, затым — факультэт беларускай філалогіі і культуры педагагічнага ўніверсітэта, дзе амаль усе прадметы (за выключэннем, вядома, рускай мовы) выкладаліся па-беларуску, — маё моўнае асяроддзе з самага пачатку было (ды і застаецца) беларускім. Гаварыць і думаць на роднай мове — для мяне тое ж самае, што і дыхаць. А ў тым, што роднага слова як паветра не хапае, не аднойчы пераконвалася, калі падчас адпачынку даводзілася гаварыць па-руску...

Ні ў якім разе не хачу зняважыць цудоўную рускую мову, люблю і шаную літаратурныя творы, напісаныя на ёй. Але, на мой погляд, наша бяда — у адсутнасці шырокага беларускамоўнага асяроддзя. Сёння нават вясковыя школьнікі імкнуцца гаварыць (як ім здаецца) па-руску. Што ўжо казаць пра тых выхадцаў з сяла, якія актыўна «заваёўваюць» сталіцу ды іншыя гарады.

...У Полацку, у музеі беларускага кнігадрукавання, увагу наведвальнікаў прыцягвае скульптура жанчыны, чый убор складаецца напалову з шыкоўнага, напалову са сціплага, беднага адзення. «Гэта, — тлумачыць экскурсавод, — алегарычная выява беларускай мовы. Святочнае ўбранне сімвалізуе перыяд росквіту, калі яна была афіцыйнай мовай дзяржаўных дакументаў у часы Вялікага Княства Літоўскага. А вось іншае — гады, дакладней стагоддзі, калі роднае слова было ў занепадзе».

І хоць у сціплым адзенні роднае слова і сёння, здараецца, «ходзіць» часцей, чым у шыкоўных строях, гэта не замінае яму зіхацець, пералівацца найпрыгажэйшымі адценнямі. Гэтай жа сціплай, але чыстай ручаінкай яно ўсё ж бруіцца, а значыць, жыве наша родная мова.

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

## Думаю так

# Нас губіць не інтэрнэт...

**Апошнім часам — і ўсё часцей, на жаль, — прыходзяць жудасныя навіны: то ў метро нехта прынёс узрыўчатку, то ў гандлёвы цэнтр зайшоў з бензапілой, то недзе знайшлі дзіця з прыкметамі ўдушэння... Ці вось — апошняе: падлетак з нажом пайшоў на настаўніцу і сваіх аднагодкаў. Два чалавекі загінулі — у мірны час, сярод белага дня. Тут міжволі ўпадзеш у ступар.**

Яшчэ можна неяк зразумець падзенне крана, абрушэнне сцяны ці даху, дзе віной прыродныя катаклізмы, чыйсьці недагляд, разгільдзяйства. Але тут... Няма тлумачэння. Усё па-за межамі розуму.

Ведаю, пройдзе нейкі час і, напэўна ж, высветляцца матывы ўчынкаў. Можа, не ўсё так проста было ў сям'і ціхага, сціплага хлопца, можа, у школе выхаваўчая работа кульгала (хоць, упэўнены, нічому дрэннаму там ніхто дзяцей не вучыў!). Тады адкуль гэта ўсё бярэцца? Як такое можна прадбачыць і прадухіліць? Ці не дойдзе да таго, што нам прыйдзецца пазбягаць людзей? Ці не надыдуць часы, калі на вуліцу, на працу, на заняткі мы будзем хадзіць у нейкіх бронекамізэльках?

Кажуць, інтэрнэт ды тэлебачанне вінаватыя, яны, маўляў, разбэшчваюць дзяцей ды і дарослых...

На мой погляд, гэта ўсё лухта. Нам не хапае жывых чалавечых зносін у сем'ях, у школе, у працоўных калектывах, нас губіць паўсюдная абыякавасць і раз'яднанасць, мы жывём па прынцыпе «мая хата з краю», аж пакуль у яе не прыйдзе бяда.

**Аляксандр Матошка,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён.*

## Была вайна

# А памяць жывая!

**...Летнім вечарам старыя збяруцца на лаве побач з хатай дзеда Алёшы і пачынаюць успаміць сваё ваеннае дзяцінства, гаварыць пра страчаных бацькоў, расстраляных родных і блізкіх, пра партызанаў, пра тое, як сясцёр зганялі ў Германію. А дзеці прыціхнуць і задумаюцца.**

Больш за ўсіх расказваў дзед Алёша (на вёсцы яго завуць Пятровічам). Ён згадваў, як фашысты сагналі ў хлеў партызанскія сем'і з малымі дзецьмі, як плакалі людзі... Помніў дзядуля, як яго бацька дапамагаў партызанам, а пасля пайшоў у дзейную армію, як потым маці засталася адна з чатырма дзеткамі ў зямлянцы. Як ён стаў для яе памочнікам і ў свае 14 гадкоў будаваў дом...

Пятровіч часта прыгадваў бацьку, які прайшоў фінскую вайну і загінуў у 1944 годзе ва Усходняй Прусіі. Але яго засмучала, што ён не ведае, дзе знаходзіцца магіла роднага чалавека. Сям'я пачала пошукі. Напісалі ў архіў. Звярнуліся ў ваенкамат. І вось прыйшло паведамленне, што Курсевіч Пётр Фёдаравіч быў пахаваны ва Усходняй Прусіі і што яго прах пазней быў перанесены на брацкія могілкі ў сяле Калініна...

Пятровіч пачаў збірацца, разам з ім вырашылі ехаць і яго сыны. З родных могілак узялі па жмені зямлі, акуратна завязалі ў хустачку. Калі ехалі па сёлах і гарадах Калінінградскай вобласці, усюды бачылі брацкія магілы. Гэта ж колькі людзей! Колькі крыві праліта!

На адной з пліт у сяле Калініна знайшлі знаёмае прозвішча. Пятровіч падышоў да пліты, стаў на калені, сказаў: «Прывітанне, бацька! Я так доўга чакаў гэтай сустрэчы. Каб ты ведаў, як цяжка мне было жыць без цябе...»

Сын горка плакаў і доўга расказваў пра сваё жыццё. Плакалі і мы, і мясцовыя жыхары, якія аказаліся побач.

Сыны Пятровіча паклалі кветкі на пліту, асыпалі прывезенай роднай зямлёй, каб дзядулі было спакойна і каб ён ведаў, што яго не забылі.

**В. Курсевіч.**

**АД РЭДАКЦЫІ. Так, памяць жывая. Яна — у дагледжаных магілках, у сямейных архівах, у запісах школьнікаў, якія сустракаліся з ветэранамі, малалетнімі вязнямі. Але час ляціць — і ўсё менш застаецца не толькі сведкаў, якія вайну бачылі на свае вочы, але і тых, хто ведае пра яе з першых вуснаў. А значыць, мы страчваем не проста дэталі, якія маглі б дапаўняць агульнавядомыя звесткі, але і лёсы, імёны, незаўважныя «маленькія» подзвігі, без якіх не было б вялікай перамогі, эмоцыі, без якіх не адчуць той драматычны час. І нават запісаныя ў нататніку ці вучнёўскім сшытку ўспаміны з цягам часу могуць згубіцца... Як захаваць гэту памяць, як падзяліцца такімі ведамі? Дасылайце ў «Звязду». Расказвайце не толькі пра ваенныя дзеянні, партызанскі рух, жахі, звязаныя з тым часам, але і пра тое, як «ажывалі», аднаўляліся, адбудоўваліся пасля вайны, як знаходзілі страчаных родных.**

## Уражанні

# ГІМН ЖЫЦЦЮ І ЖАНЧЫНЕ

**Вершы паэта Міколы Шабовіча часта друкуюцца ў газетах і часопісах. Сабраныя ж разам, у зборніку «Маладыя мроі маладога лета», яны адразу бяруць у палон, выступаюць сапраўдным гімнам жанчыне, каханню, жыццю:**

*Вачэй спакуснае свята*
*Мне будзе помніцца да ранку.*
*Здалося, сонейка ўзышло,*
*Як ты з'явілася на ганку...*

Такое вось «сонейка» — свае незабыўныя сустрэчы, радасці і пакуты кахання — было альбо ёсць амаль што ў кожнага, і якраз пра яго піша паэт у вершах «Ты сягоння прынесла вясну...», «Трапяткое спакуснае лета...», «Яшчэ так хочацца сваволіць...», «Я ў тваіх пацалунках свае забываю гады...», «Такую ўбачыць прыгажосць — і не заснуць да самай раніцы»...

Ёсць у зборніку і творы пра Бацькаўшчыну, сям'ю, вернасць справе і сябрам:

*Ды кожны кут па-свойму, пэўна ж, міл,*
*Бо толькі там, дзе нашыя вытокі,*
*Сабе жыццёвых назапасім сіл*
*На новыя — акрыленыя — крокі.*

Хочацца адзначыць вобразнасць мовы паэта. Вось як, напрыклад, ён апісвае прыроду пасля дажджу:

*Ажылі прывялыя ўжо травы,*
*Кветкі ўверх прыўзнялі галаву,*
*І дубок маленькі кучаравы*
*Нібы шэпча некаму: «Жыву!»*

Прачытаў — і быццам убачыў гэтую прыгажосць, быццам пачуў слова. І ўжо гатовы адгукнуцца на заклік паэта, падарыць —

*Радзіме — адданасць,*
*Бацькам — дабрыню і любоў,*
*Сябрам — беззаганнасць*
*Учынкаў, памкненняў і слоў.*

Упэўнены, што гэта — крэда і самога паэта, якому пакуль толькі 60.

**Міхась СЛІВА,**
*г. Рагачоў.*


Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении аукциона** | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37 | | |
| **Предмет аукциона (одним лотом) Месторасположение: Минская обл., г. Жодино, ул. Дорожная, д. 2** | | | |
| Наименование (назначение) | Об. пл. | Инвентар. номер | Адрес (№ дома) |
| **Здание ремонта транспорта** (здание специализир. для ремонта и технич. обслуживания автомобилей (в т. ч. автомоб. заправоч. и газонаполнит. станции) | 78 | 612/С-7856 | 2/8 |
| **Здание склада** (здание специализир. складов, торгов. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ) | 404 | 612/С-4244 | 2/7 |
| **Здание склада** (здание склада) | 234,5 | 612/С-5843 | 2/1 |
| **Здание мастерских** (здание неустан. назначения) | 458 | 612/С-4246 | 2/3 |
| **Здание ангара** (здание неустан. назначения) | 661 | 612/С-4240 | 2/2 |
| **Здание столярного цеха** (здание специализир. обрабат. промышленности) | 113,7 | 612/С-4248 | 2/5 |
| **Здание административно-бытового корпуса** (здание административно-хозяйственное) | 318,8 | 612/С-4999 | 2 |
| ***Составные части и принадлежности:*** пристройка – 1, навес – 2, пристройка – 3, ограждение – а1, ограждение – а2, ограждение – а3, ограждение – а4, ограждение – а5, покрытие – а6, покрытие – а7, площадка ТБО – а 8 | | | |
| **Здание-склад масел** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 55 | 612/С-4241 | 2/4 |
| **Электролиния ВЛ-0.4** (сооружение специализир. энергетики) | 509,7 м | 612/С-6757 | 2 |
| ***Составные части и принадлежности:*** (Б) кабельная электролиния, (а1-а14 ) опоры, (В) подстанция (КТП-160кВа-10/0.4) | | | |
| **Здание автозаправочной станции** (здание специализир. для ремонта и технич. обслуживания автомобилей (в т. ч. автомоб. заправоч. и газонаполнит. станции) | 6,7 | 612/С-4242 | 2/6 |
| ***В состав лота входит следующее имущество:*** навес для хранения дров №1 (55,2 кв. м), навес для хранения дров №2 (41,25 кв. м), вагон-проходная (13,5 кв. м, инв. № 1057), цистерна 25м³ (инв. № 12116), котел КЧМ-5-К-40-71 (инв. № 128), котел КЧМ-5-К-80-03 (инв. № 135), система видеонаблюдения (инв. № 362), электро-тельфер 3Т-71-6 (инв. № 4258), кран-балка (инв. № 4503), пожарная сигнализация (инв. № 120), пожарная сигнализация (инв. № 121), шлагбаум (инв. № 207), котел КВр-0,12 К "Универсал РТ" (инв. № 138), трансформатор ТМ-160 (инв. № 771) | | | |
| **Сведения о земельном участке: пл. 1,9586** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений производственной базы. Ограничения (обременения) прав: охранная зона канализационных коллекторов, пл. 0,2678 га | | | |
| **Обременения**: площади ангара сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 002 180,12 бел. руб.** | | | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия. | | | |
| **Дата и время проведения аукциона: 27.03.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.03.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | | |



**ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ЮНИМИТ»**
(222220, РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ, МИНСКАЯ ОБЛ., СМОЛЕВИЧСКИЙ РАЙОН, ПЛИССКИЙ СЕЛЬСОВЕТ, 9/12, В РАЙОНЕ ПОСЕЛКА ОКТЯБРЬСКИЙ)
СООБЩАЕТ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ

Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям: 14.02.2019.

Дивиденды, начисленные на одну простую (обыкновенную) акцию: 12 375,00 бел. руб. Привилегированные акции отсутствуют.

Срок и порядок выплаты дивидендов по акциям: в течение 60 дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов наличными денежными средствами в кассе общества либо путем безналичного перечисления на указанный акционерами счет в банке.

УНП 690660279.



21 МАРТА 2019 ГОДА В 14.00 СОСТОИТСЯ
**ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ВИШНЕВКА-2010»**
ПО АДРЕСУ: МИНСКАЯ ОБЛАСТЬ, МИНСКИЙ РАЙОН, АГ. ВИШНЕВКА, УЛ. ЦЕНТРАЛЬНАЯ, Д. 1А (АКТОВЫЙ ЗАЛ).

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. «Об итогах развития ОАО «Вишневка-2010» за 2018 год и задачах по обеспечению выполнения прогнозных показателей социально-экономического развития на 2019 год».
2. «Отчет наблюдательного совета о работе в 2018 году».
3. «Отчет (заключение) ревизионной комиссии о работе в 2018 году».
4. «Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках, рассмотрении аудиторского заключения за 2018 год».
5. «Об избрании членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Вишневка-2010».
6. «Утверждение размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Вишневка-2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 21 марта 2019 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания. Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600041880 **Наблюдательный совет ОАО «Вишневка-2010»**



# Мінулы год можна назваць стабільным

**Як спрацавалі капыльскія вытворцы летась, чым Капыльскі раён жыве сёння і якія планы на перспектыву. Пра гэта і іншае расказаў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Анатоль ЛІНЕВІЧ.**



***— Анатоль Канстанцінавіч, Капыльскі раён сельскагаспадарчы. А мінулы год быў не зусім спрыяльным для раслінаводства. З якімі вынікамі яго закончылі?***

— Умовы надвор'я былі сапраўды не надта добрыя — дажджы змянялі засуху і наадварот. Ураджай збожжавых і зернебабовых культур атрымалі на ўзроўні 70 % да папярэдняга года. Гэта сярэднерэспубліканскі паказчык. Разам з тым мінулы год можна назваць стабільным. Мы прыклалі ўсе намаганні для таго, каб «падцягнуць» ураджай за кошт зерня кукурузы. Упершыню ў гісторыі раёна летась сабралі яго 31 тыс. тон. Валавы збор збожжавых і зернебабовых склаў 88 тыс. тон пры ўраджайнасці 27,5 цэнтнера з гектара. Вядома, такі вынік нас не задавальняе, таму заклалі добры фундамент для атрымання будучага ўраджаю. Падчас восеньскай пасяўной павялічылі плошчу азімых збожжавых на 3 тыс. гектараў і давялі яе практычна да 26 тыс. гектараў. Спадзяёмся, што гэты год будзе спрыяльным для сельгасвытворцаў. Хоць, калі параўноўваць сітуацыю па тэхнічных культурах, той жа кукурузе, то нарыхтавалі сіласу на 10 тыс. тон больш, амаль 300 тыс. тон. Гэта найлепшы вынік у параўнанні з папярэднімі гадамі. Назапасілі 205 тыс. тон сенажу: 29 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы, што ў сваю чаргу дазволіла стабільна працаваць па вытворчасці малака.

Нядрэнна спрацавалі па цукровых бураках, атрымалі 303 тыс. тон. Гэта адзін з самых вялікіх валавых збораў сярод раёнаў вобласці. Па аб'ёме вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за 2018 год Капыльскі раён 7-ы сярод 22-х раёнаў вобласці. Мы з'яўляемся адным з самых буйных вытворцаў буракоў у Беларусі, іх пасевы займаюць плошчу 6800 гектараў. Займаемся таксама вырошчваннем бульбы. Адкрытае акцыянернае таварыства «Старыца-Агра» — элітная гаспадарка па вытворчасці бульбы і насення бульбы. Летась прадпрыемства сабрала 328 цэнтнераў клубняў з гектара. Добра ўрадзіў і рапс — 23 цэнтнеры з гектара, а валавы збор гэтай культуры па раёне амаль 14 тыс. тон.

Што датычыцца жывёлагадоўлі, то паказчыкі ўдалося ўтрымаць на ўзроўні мінулага года. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылі на 2 тысячы, у тым ліку на 0,4 тысячы дойных кароў, і грамадскі статак сёння налічвае 65 тыс. жывёлін. Ставім перад сабой задачу: валавыя надоі давесці да 100 тыс. тон у год. Думаю, гэта цалкам рэальна, паколькі сёння ідзём з прыростам па рэалізацыі малака на 105 %.

Акрамя таго, вялікую ўвагу аддаём фінансаваму аздараўленню сельгасарганізацый. Гэта стала магчымым дзякуючы Указу Прэзідэнта № 399. Іх у нас сем. Прапрацавалі пытанне з усімі крэдыторамі, выслалі адпаведнае паведамленне, якое мае на ўвазе пад сабой адтэрміноўку плацяжу на тры гады з наступнай растэрміноўкай на пяць гадоў. Гэта дастаткова эфектыўная дапамога для гаспадарак, якая дазволіць стабілізаваць сітуацыю.

***— А як з кадрамі на сяле, Анатоль Канстанцінавіч, хапае спецыялістаў?***

— У сельскай гаспадарцы працуе 3900 чалавек. У прынцыпе, спецыялістаў дастаткова, пытанняў тут не ўзнікае. Працуем у цесным кантакце з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Напрыклад, з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам, Беларускім аграрным тэхнічным універсітэтам, Палескім дзяржаўным універсітэтам, Горацкай сельгасакадэміяй. Частка маладых спецыялістаў пасля абавязковай адпрацоўкі сыходзіць. Таму набіраем новых. На сённяшні дзень пэўныя праблемы ёсць па забеспячэнні інжынерна-будаўнічымі кадрамі. Але яны цалкам вырашальныя. У гэтым плане працуем з Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, Гомельскім дзяржаўным універсітэтам, дзе рыхтуюць архітэктараў.

***— Якімі прадпрыемствамі прадстаўлена ў раёне прамысловасць?***

— У раёне працуе камбінат кааператыўнай прамысловасці, філіял Слуцкага сыраробнага камбіната. За мінулы год гэтыя прадпрыемствы паказалі рост больш як на 100 працэнтаў. «Кааппрам» будуе новую забойную пляцоўку, што дазволіць удвая павялічыць перапрацоўку сыравіны. Ужо атрыманае абсталяванне цераз «Прамагралізінг». Філіял сыраробнага камбіната 95 % прадукцыі экспартуе ў Расію, спажыўцы своечасова разлічваюцца з вытворцамі. Сыры маюць добры попыт і збыт.

Ёсць у нас і прадпрыемства прыватнай формы ўласнасці «БетонБокс». Летась з яго дапамогай выканалі праграму будаўніцтва сіласных і сянажных траншэй. Усяго ўладкавалі 56 траншэй. Гэта немалы аб'ём. Сёлета яшчэ адно прадпрыемства, прыватнай формы «БелМайстарБокс», якое аказвае будаўнічыя паслугі, выйграла тэндар у Расіі. Спадзяёмся, што ён замацуецца дагаворам.

***— Капыль па праве можна назваць кузняй кадраў для айчыннага біятлона...***

— Навучэнцы трымаюць даволі высокі ўзровень у спартыўным жыцці. Каманда школьнікаў у складзе 12 чалавек заняла першае месца ў вобласці ў лыжных гонках, будзе выступаць у рэспубліканскіх спаборніцтвах. У нас вельмі моцная зборная па біятлоне. Падрыхтоўкай біятланістаў займаецца дзіцяча-юнацкая спартыўная школа. Ураджэнцы горада і раёна такія вядомыя спартсмены-біятланісты, як Аляксандр Сыман, Антон Смольскі, Дар'я Юркевіч. Цяпер працуем над праектаваннем і аднаўленнем біятлоннай трасы. У Капылі ладзяцца і міжнародныя спаборніцтвы, як напрыклад фестываль бегу і пераадольвання перашкод «Капыль-рэйс». Гэта маштабнае і відовішчнае мерапрыемства, сёлета пра свой удзел у ім заявілі 500 чалавек.

***— За апошнія гады Капыль стаў больш утульным, тут з'явіўся дэндрапарк, акультураны берагі вадаёма. У працяг Года малой радзімы на якія аб'екты будзе скіравана ўвага?***

— Пытаннямі навядзення парадку на зямлі, добраўпарадкаваннем займаемся пастаянна. І, вядома, гэтая работа прадоўжыцца. Мы бачым шляхі рашэння праблем. Ёсць кароткатэрміновыя праекты. Ёсць і такія, што скіраваны на доўгатэрміновую перспектыву і патрабуюць фінансавых сродкаў. Шукаем грошы, крыніцы фінансавання. Горад расшыраецца, прырастае аб'ектамі жыццядзейнасці. Наспела будаўніцтва пункта па рабоце з цвёрдымі камунальнымі адходамі. Гэта павінен быць сучасны аб'ект з усім неабходным абсталяваннем па паглыбленай сарціроўцы адходаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# МАСТАЦТВА ПЕРАВОЗАК

**Капыльскаму філіялу «Аўтамабільны парк № 21» адкрытага акцыянернага таварыства «Мінаблаўтатранс» ёсць што паказаць і чым здзівіць гасцей раёна, турыстаў.**



Нядаўна на дарогах Капыльшчыны пачалі курсіраваць тры пасажырскія аўтобусы маркі «МАЗ» з выявай знакамітых землякоў. На адным з іх — партрэт Героя Беларусі Міхаіла Высоцкага — заснавальніка айчыннага машынабудавання. Доўгі час Міхаіл Сцяпанавіч працаваў галоўным канструктарам Мінскага аўтамабільнага завода. А нарадзіўся ён у вёсцы Семежава Капыльскага раёна. І гэты аўтобус — сведчанне таго, што на малой радзіме не забываюць пра вядомага земляка і аддаюць яму даніну павагі.

Капыльская зямля багатая на людзей, якія ўнеслі ўклад у развіццё раёна, Мінскай вобласці, краіны. На борце яшчэ аднаго аўтобуса змешчаны партрэт ураджэнца Капыля Зміцера Жылуновіча.

— Зміцера Хведаравіча ведаюць пад псеўданімам Цішка Гартны як драматурга, празаіка, паэта, журналіста, крытыка. У 1919 годзе ён быў старшынёй Часовага рабоча-сялянскага ўрада Савецкай Беларусі, які праіснаваў літаральна некалькі месяцаў. Партрэт з'явіўся летась напярэдадні 100-годдзя БССР, як даніна памяці чалавеку, які стаяў каля вытокаў беларускай дзяржаўнасці, — расказаў **дырэктар філіяла Уладзімір САХАР**.

Помняць і шануюць на Капыльшчыне і яшчэ аднаго земляка — паэта-песенніка Адама Русака, які нарадзіўся ў невялікай вёсачцы Малінаўка. Яго партрэт аздобіў трэці аўтобус. На адным баку — словы песні «Бывайце здаровы», з другога — не менш вядомай і папулярнай песні «Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры».

Знамянальна, што партрэт і надпісы з'явіліся летась напярэдадні Дня беларускага пісьменства, які сімвалізуе пераемнасць традыцый, повязь розных пакаленняў, адзінства друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа.

Пагадзіцеся, прыемна ехаць на такім транспарце, які стаў брэндам Капыльшчыны, дапамагае больш даведацца аб мінулым гэтага шчодрага на таленты краю. А яшчэ, на маю думку, такім чынам мясцовыя транспартнікі садзейнічаюць прыцягненню турыстаў: апошнім часам у раёне распрацавана шмат цікавых турыстычных маршрутаў.

Наогул, калектыў імкнецца развівацца, удасканальвацца, пры гэтым захоўваючы традыцыі, усё лепшае ад сваіх папярэднікаў, з кожным годам павялічвае аб'ёмы пасажырскіх і грузавых перавозак. На сённяшні дзень у філіяле штодзень выходзяць у рэйс 26 аўтобусаў, якія абслугоўваюць тры гарадскія маршруты, 21 прыгарадны і тры міжгароднія. Акрамя таго, 24 грузавыя аўтамабілі ажыццяўляюць грузавыя перавозкі не толькі ў межах Капыльскага раёна, але і па Мінскай вобласці, Беларусі, працуюць на знакавых рэспубліканскіх будоўлях, як напрыклад, Нежынскі горна-ўзбагачальны камбінат у Любанскім раёне. На гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх перавозках дзейнічае аўтаматызаваная сістэма дыспетчарскага кіравання.



Кіроўцы Аляксандр ГАНЧАР, Ігар РУДЗЕНЯ, Аляксандр ЗОРЫЧ — прызнаныя майстры сваёй прафесіі.



На борце гэтага аўтобуса напісаны словы з шырока вядомай песні «Бывайце здаровы, жывіце багата» і партрэт яе аўтара земляка-паэта Адама Русака.



Начальнік дыягнастычнай станцыі № 123 Аляксандр БАЛАЖЫНСКІ.

У аўтапарку працуе дыягнастычная станцыя № 123, аснашчаная сучасным абсталяваннем. Яе паслугі карыстаюцца вялікім попытам. Дзяржаўны тэхнічны агляд тут праходзяць не толькі транспартныя сродкі з Капыльскага раёна, але і навакольных — Салігорскага, Нясвіжскага, Клецкага, Слуцкага. Аўтаўладальнікі ведаюць, што на станцыі працуюць прафесіяналы высокага класа, якім можна даверыцца, і яны зробяць усё як мае быць, своечасова, якасна.

Аўтапарк аказвае таксама экскурсійна-турыстычныя паслугі па заяўках насельніцтва, прадпрыемстваў, арганізацый. Тут можна заказаць аўтобус, які даставіць у любы пункт Міншчыны, краіны дзяцей і дарослых.

Перавозкі грузаў і пасажыраў — гэта свайго роду мастацтва. Неабходна людзей даставіць па любым адрасе хутка, своечасова, без надзвычайных здарэнняў. І бяспека пасажыраў залежыць ад майстэрства і прафесіяналізму кіроўцы.

— Людзі — наш залаты фонд. Менавіта яны сваёй добрасумленнай працай, прафесіяналізмам ствараюць імідж прадпрыемства, — упэўнены Уладзімір Яўгенавіч. — Кіроўца аўтобуса Іван Каляда працуе ў аўтапарку больш за сорак гадоў. Іван Васілевіч удастоены звання «Ганаровы транспартнік Рэспублікі Беларусь». У нас шмат кіроўцаў, якія водзяць аўтобусы больш за 35, 40 гадоў. У прыватнасці, Віктар Лойка, Мікалай Шыдлоўскі, Анатоль Шчурскі, Аляксандр Сердзюкоў. Арцём Русаковіч, Дзмітрый Баран — маладыя кіроўцы, але ўжо зарэкамендавалі сябе з найлепшага боку. На грузавых машынах шмат гадоў працуюць Уладзімір Варчэня, Алег Дунай, Мікалай Мяцельскі. Мы ганарымся моцнымі традыцыямі, якія закладваліся прадстаўнікамі розных пакаленняў, працоўнымі дынастыямі Рудніцкіх, Варчэняў, Ткачукоў-Струнеўскіх, Каласко.

Разам з тым на прадпрыемстве разумеюць: для плённай працы неабходна стварыць і адпаведныя ўмовы. Напрыклад, прафесійнаму росту садзейнічае сістэма даплат за класнасць і майстэрства. Адміністрацыя сумесна з прафсаюзным камітэтам імкнуцца штогод паляпшаць умовы працы і адпачынку сваіх работнікаў. Для іх уладкаваны раздзявалка, душавая, пакой для прыёму ежы з неабходнай бытавой тэхнікай, буфет. У клубе праводзяцца культурныя мерапрыемствы, святы. Неаднаразова каманда аўтапарка займала прызавыя месцы ў спаборніцтвах, алімпіядах «Мінаблаўтатранса», раённага і абласнога ўзроўняў.

УНП 601076063

# ЗЯМЛЮ НЕ ПАДМАНЕШ: ШТО Ў ЯЕ КІНЕШ, ТОЕ І АТРЫМАЕШ

## Так лічыць дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Старыца-Агра» Капыльскага раёна Уладзімір Рудакоўскі

**Нядаўна дырэктару таварыства Уладзіміру Рудакоўскаму прысвоена званне «Чалавек года Міншчыны». Гэтае пачэснае званне надаецца толькі самым творчым, прагрэсіўным, паспяховым працаўнікам і кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый вобласці — найлепшым з найлепшых. «Гэта давер калектыву, заслуга механізатараў, паляводаў, жывёлаводаў. Тое, чаго ўдалося дасягнуць гаспадарцы, — вынік іх самаадданай працы, ведаў, прафесіяналізму. Бо, як кажуць, адзін у полі не воін. І без іх дапамогі нельга выканаць пастаўленыя задачы», — лічыць Уладзімір Анатолевіч.**



Дырэктар ААТ «Старыца-Агра» Уладзімір РУДАКОЎСКІ.

ААТ «Старыца-Агра» — самае буйное і самае паспяховае сельгаспрадпрыемства на Капыльшчыне. Стабільнае развіццё гаспадаркі апошнія чатырнаццаць гадоў непарыўна звязана з імем яе дырэктара. Кіраўнік валодае якасцямі гаспадара, які ўмее планаваць свае дзеянні і планы наперад. Гэта прыносіць вынікі ў вытворчасці мяса, малака, раслінаводстве. А значыць, дае магчымасць умацоўваць пазіцыі гаспадарчай і фінансавай дзейнасці, матэрыяльна-тэхнічнай базы і развіваць далей патэнцыял таварыства.




У гандлёвай зале магазіна «Крынічка». Тут працуюць прадаўцы Ірына ЦЯРЭШЧАНКАВА і Святлана ЧЭРНІК.

**Святлана ЧЭРНІК, прадавец:**
— У нас даволі разнастайны асартымент прадуктаў. Тавараў прамысловай групы крыху менш, працуем з імі пад заказ пакупнікоў. Ёсць малочная прадукцыя, крупы, мука, макарона. Кожны дзень завозім хлеб. У пэўныя дні — мясныя і каўбасныя вырабы з розных мясакамбінатаў вобласці. Тавар на паліцах не залежваецца, бо заўсёды свежы, пастаянна абнаўляецца.

«Старыца-Агра» спецыялізуецца на вырошчванні бульбы. Яе высаджваюць на плошчы каля 200 гектараў, выкарыстоўваюць насенне замежных селекцый, пераважна з Германіі, і суперэлітны пасадачны матэрыял айчыннай вытворчасці Інстытута пладаводства і агародніцтва Нацыянальнай акадэміі навук. Мінулы год прынёс добры ўраджай «другога хлеба», на захаванне паклалі каля шасці тысяч тон клубняў. Старыцкая бульба добра сябе зарэкамендавала ў спажыўцоў і карыстаецца попытам не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў краіне. Акрамя таго, «Старыца-Агра» славіцца цукровымі буракамі, сёлета іх рэнтабельнасць склала больш за 25 %. Каля 18 тысяч тон караняплодаў прадалі на Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат, атрымалі нядрэнную выручку.

У акцыянерным таварыстве займаюцца таксама збожжавымі і зернебабовымі культурамі, кукурузай. У пачатку мінулага года тут выканалі ўсе тэхнічныя рэгламенты па сяўбе, унеслі поўную запраўку ўгнаенняў як калійных, так і фосфарных, азотных, закупілі практычна ўсё элітнае насенне. Але на ўраджайнасць паўплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я — засуха. На пясчаных участках ураджай практычна выгараў. У выніку сабралі зерня збожжавых на 4 тысячы тон менш, чым у папярэднім годзе. Ды недахоп кампенсавалі зернем кукурузы: атрымалі яго 7 тысяч тон, што больш на 3,5 тысячы тон за ўзровень 2017-га. Частку кукурузнага зерня рэалізавалі на выручку, частку паклалі на корм жывёле. Значную ўвагу ў гаспадарцы аддалі нарыхтоўцы травяністых кармоў, паколькі жывёла знаходзіцца круглы год на стойлавым утрыманні, як на адкорме, так і дойны статак. Назапасілі больш за 33 тысячы тон сіласу і больш як 35 тысяч тон сенажу, каля 2 тысяч тон сена. Гэтага з лішкам хопіць да канца года, і рэшта пяройдзе на наступны. Парадаваў летась і рапс — 42 цэнтнеры з гектара. Гэта найлепшы паказчык у раёне.

Малако ў каровы, як кажуць, на языку. Як пакорміш, так і надоіш. У гаспадарцы грамадскі статак налічвае 2200 галоў буйной рагатай жывёлы. Летась надаілі практычна каля шасці тысяч кілаграмаў малака на кожную рагулю. Штодзень тут прадаюць каля 30 тон малака ў капыльскі філіял Слуцкага сыраробнага камбіната. Яшчэ каля 15 тон прадукцыі здаюць на Мінскі гарадскі малочны завод № 1. Прычым 95 % малака ідзе сортам «экстра». Якасці малака — асаблівая ўвага. А на якасць, як вядома, уплываюць не толькі добрыя кармы, збалансаваны рацыён, але і здароўе жывёлы, за станам якога сочыць група ветурачоў. У выніку штомесяц гаспадарка атрымлівае выручку ад продажу малака ў памеры 600 тысяч рублёў.



Трыццаць гадоў працуе механізатарам Сяргей РОНЧЫК.

На жывёлагадоўчым комплексе «Чарнічнае» па вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы ўтрымліваецца 4 тысячы галоў. Маладняк кожныя суткі прыбаўляе ў вазе па 950—1000 грамаў. На гэта ўплываюць якасць кармоў, збалансаваны рацыён, карпатлівы догляд і прафесіяналізм спецыялістаў. Штомесяц акцыянернае таварыства прадае буйной рагатай жывёлы на 600 тысяч рублёў. Бычкоў здаюць у асноўным на Слуцкі мясакамбінат, стаўбцоўскі філіял Мінскага мясакамбіната. Здатачная вага кожнага бычка ў сярэднім 450 кілаграмаў. Адначасова тут займаюцца ўзнаўленнем статка: паралельна закупляюць штомесяц прыкладна 300—350 галоў маладняку. Прадукцыя жывёлагадоўлі — мяса і малако — дае гаспадарцы 65—70 % гадавой выручкі, астатнюю прыносіць раслінаводства.

Гаспадарка забяспечана ўсім неабходным, каб утрымліваць дасягнутае ў раслінаводстве, жывёлагадоўлі і рухацца наперад: машынамі, трактарамі, пасяўной і ўборачнай тэхнікай, прычапным інвентаром да яе. Але самае галоўнае, як лічыць Уладзімір Рудакоўскі, гэта працавітасць, кампетэнтнасць, прафесіяналізм работнікаў і спецыялістаў. Дарэчы, сярэдні ўзрост іх каля 45 гадоў.

Вядома, за «дзякуй» ніхто працаваць не будзе. Кіраўнік разумее, што ўтрымаць кадры можна дастойнай зарплатай, сацыяльнымі гарантыямі і квадратным метрам. Жыллё будуецца кожны год у межах рэспубліканскай праграмы адраджэння вёскі за кошт крэдытных рэсурсаў. Сёлета таксама плануюць увесці ў эксплуатацыю жылы дом, які не закончылі летась. Усе дамы газіфікаваны. Для работнікаў, што мелі патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе на падвядзенне «блакітнага паліва», гаспадарка выдзеліла беспрацэнтную пазыку на паўтара-два гады ў памеры 10 мільёнаў «старых» рублёў. Затым штомесяц пакрыху гэтую суму вылічвалі з зарплаты.



Галоўны спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Ірына КАВАЛЕНКА і дыспетчар Аксана БЫКАВА.

У акцыянернага таварыства ёсць свой магазін. Пры неабходнасці ў ім пад заказ можна набыць мэблю, бытавую тэхніку ў растэрміноўку без працэнтаў на 3—6 месяцаў. Тут можна ўзяць і прадукты харчавання на пэўную суму ў лік будучай зарплаты. Праз краму выдаюць работнікам і нагародныя падарункі. Паколькі ў таварыстве працуе 550 чалавек, то такая сістэма дазваляе пазбегнуць чэргаў. Памяшканне рэстарана здаецца ў арэнду пад розныя мерапрыемствы, сямейныя ўрачыстасці, карпаратывы. Людзей задавальняе сэрвіс, абслугоўванне, невялікі кошт арэнды залы. Работнікі сталовай гатуюць абеды для хлебаробаў гаспадаркі падчас масавых палявых работ, прыкладна 200 абедаў і вячэр. Харчаванне для іх возяць у поле спецыяльна абсталяванай машынай. Першае, другое з гарнірам і мяснымі вырабамі, кампот або сок — на абед. Затым — падвячорак. За паўнавартаснае двухразовае харчаванне хлебаробы са сваёй кішэні даплачваюць 20 %, астатняе кампенсуе гаспадарка. Таварыства забяспечвае сталовую прадукцыяй уласнай вытворчасці: мясам, капустай, морквай, буракамі, цыбуляй, яблыкамі, што дазваляе панізіць кошт страў.



Загадчык майстэрні Віталь ЛУЦЭВІЧ і інжынер-механік Радзівон ПАПОК аглядаюць тэхніку, якую рыхтуюць да веснавых работ.

Дзякуючы чаму «Старыца-Агра» развіваецца, павышае грамадскі дабрабыт і ўзровень жыцця сваіх работнікаў? На маю думку, тут кожны работнік, спецыяліст разумее, што зямля не даруе абыякавага стаўлення і шчодра ўзнагароджвае за стараннасць, клопаты і гаспадарлівасць. «Зямлю не падманеш, што пакладзеш, тое і атрымаеш, — кажа Уладзімір Рудакоўскі. — Поспеху можна дасягнуць толькі за кошт дакладнага выканання тэхналогій, унясення ўгнаенняў».

**Аксана БЫКАВА, дыспетчар:**
— Чатыры гады таму мы пераехалі з Запарожскай вобласці Украіны. Тут нам далі дом, дапамаглі зрабіць рамонт, цяпер стаім на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Муж працуе трактарыстам-машыністам, дзеці ходзяць у школу. Мне таксама падабаецца работа, паколькі па адукацыі я бухгалтар, то працаваць з дакументамі мне лёгка. Калі пераехалі, працавала даяркай. Разумею, што не маглі адразу даць нейкую пасаду. Неабходна было праверыць, якія мы людзі, што ўмеем. Усе мы прыжыліся на гэтай гасціннай зямлі. Я вельмі ўдзячная гаспадарцы, кіраўніцтву «Старыца-Агра», нашу сям'ю ўсё тут задавальняе.

У планах на гэты год атрымаць большы ўраджай збожжавых і зернебабовых. Часткова за свае грошы, часткова за сродкі, выдзеленыя з абласнога бюджэту, у гаспадарцы набываюць азотныя ўгнаенні, праз Капыльскі райаграсэрвіс працуюць з «Беларуськаліем» па закупцы калійных угнаенняў, заключылі дагавор з Гомельскім заводам для куплі фосфару. Адначасова займаюцца рамонтам тэхнікі, энерганасычаных трактароў, якіх налічваецца 16. Практычна на 100 % адрамантаваны пасяўныя агрэгаты. Цяпер узяліся за корманарыхтоўчую тэхніку.

**Віталь ЛУЦЭВІЧ, загадчык мехмайстэрняў, малады спецыяліст:**
— Я нарадзіўся ў гэтых мясцінах. Пасля заканчэння Капыльскага каледжа вярнуўся дамоў. Жанаты, двое дзяцей. Гаспадарка выдзеліла дом з усімі бытавымі выгодамі. Жонка па спецыяльнасці эканаміст. Мяркую, пасля выхаду з дэкрэтнага водпуску яе прымуць на работу. Што датычыцца тэхнікі, то яна рамантуецца добрымі тэмпамі, каб своечасова, у азначаныя тэрміны, пачаць сяўбу.

У дырэктара шмат планаў і задум на перспектыву. У мінулым годзе, напрыклад, пабудавалі тры сянажныя траншэі, для набыцця будматэрыялаў палову ад неабходнай сумы выдзелілі з абласнога бюджэту, а ўсе работы правялі гаспадарчым спосабам. У прадпрыемства ёсць свая будаўнічая брыгада з 17 чалавек, неабходны транспарт. Дадаткова плануецца пабудаваць яшчэ тры сянажныя траншэі, увесці ў дзеянне двухкватэрны жылы дом. А ў Старыцы падыходзіць да заканчэння ўзвядзенне малочнатаварнага комплексу на 580 галоў жывёлы. «У гэтым дапамог Мінаблвыканкам, які выдаткаваў на набыццё жалезабетонных канструкцый каля 35 тысяч рублёў, — канстатуе дырэктар. — Праз бюджэт абяцаюць па лізінгу выдзеліць дойку».

— Кіраўніцтва сельгасарганізацыі працуе ў цесным кантакце з прафсаюзным камітэтам, іншымі грамадскімі арганізацыямі, установамі культуры, адукацыі, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, — дадае галоўны спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Ірына Каваленка. — Разам віншуем ветэранаў, юбіляраў, работнікаў са святамі. Напрыклад, разам з супрацоўнікамі Старыцкага клуба ўдзельнічалі ў шэсці Дзядоў Марозаў, самі шылі касцюмы, маскі. Адміністрацыя гаспадаркі выдзяляе грошы на правядзенне разнастайных культурных мерапрыемстваў. Дапамагае таксама школам, дзіцячым садам, на Новы год усе дзеці атрымліваюць салодкія падарункі за кошт акцыянернага таварыства.



Растуць карпусы новых кароўнікаў з даільна-малочным блокам. На пярэднім плане брыгадзір КУП «Капыльскае РБУ» Анатоль МАКСІМЧЫК, прараб Уладзімір ПЫРХ, муляр Сцяпан ЧЫГІР.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 690301954

# ЗА ПАКУПНІКА ТРЭБА ЗМАГАЦЦА... ЯКАСЦЮ І АСАРТЫМЕНТАМ,

## або ХТО ШУКАЕ, ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ

**Гісторыя развіцця ўнітарнага прадпрыемства «Капыльскі кааппрам» пачынаецца з 1980 года. Хлебакамбінат, які аб'ядноўваў Капыльскі, Цімкавіцкі, Колаўскі вытворчыя ўчасткі, далучылі да каўбаснага цэха. У выніку з'явілася новая структура — камбінат кааператыўнай прамысловасці. У 1989 годзе адбылася рэканструкцыя каўбаснага цэха, што дазволіла павялічыць вытворчыя магутнасці. У сувязі са зніжэннем попыту на хлебабулачную прадукцыю ў 1993 годзе была спынена вытворчасць на Колаўскім участку, які закансервавалі з 1 ліпеня 1997 года. З 1 лістапада закансервавалі і Цімкавіцкі ўчастак.**



Кіраўнік прадпрыемства Тамара АБРАМОВІЧ з гонарам за калектыў расказвае пра вытворчыя вынікі мінулага года, адзначаныя залатым, сярэбраным, бронзавым медалямі Рэспубліканскага агляду якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката-2018».

Цяпер прадпрыемства ўваходзіць у склад Капыльскага райспажыўтаварыства Мінскага абласнога спажыўсаюза. Доўгі час, з 2004-га да 2018 года, яго нязменным кіраўніком быў Віктар Смусянок, які шмат зрабіў для развіцця вытворчасці, канкурэнтаздольнасці і паляпшэння якасці прадукцыі, пашырэння рынкаў збыту. Віктар Васілевіч шмат прыклаў намаганняў па пераасначэнні і мадэрнізацыі вытворчасці. Пры ім былі закуплены новыя печы ў хлебабулачны цэх, адрамантаваны каўбасны цэх, набыта шмат новага абсталявання. Вялікім крокам наперад стала газіфікацыя прадпрыемства. Цяпер былы дырэктар узначальвае Капыльскае райспажыўтаварыства. А яго пераемніцай стала Тамара Абрамовіч. Тамара Міхайлаўна не навічок на прадпрыемстве. Яна прайшла тут усе прыступкі службовага росту — ад тэхнолага да начальніка вытворчасці.

— Наша прадпрыемства складаецца з шасці цэхаў. Акрамя таго, ёсць жывёлабойная пляцоўка, — уводзіць у курс справы дырэктар. — Мы выпускаем і рэалізуем хлебабулачныя, каўбасныя, кандытарскія вырабы, мясныя паўфабрыкаты, мяса, рыбу салёную і вэнджаную, кукурузныя палачкі. Прадукцыя пастаўляецца па заяўках гандлёвых арганізацый спажывецкай кааперацыі, па прамых дагаворах з іншымі спажыўцамі па ўсёй Міншчыне. На экспарт прадукцыю пакуль не адпраўляем, хоць яна цалкам задэклараваная. Інакш, усё выпускаецца афіцыйна, згодна з існуючымі стандартамі. З уводам у дзеянне новай жывёлабойнай пляцоўкі спадзяёмся атрымаць экспартны нумар і пастаўляць свае вырабы ў Расію, магчыма, у Казахстан. У цяперашні час на пляцоўцы вядуцца сур'ёзныя будаўнічыя работы, на якіх сканцэнтраваны ўсе сілы. Пасля заканчэння будоўлі, поўнага тэхнічнага пераасначэння вытворчасці перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі павялічыцца ўдвая. Значыць, гэта гарантыя таго, што яшчэ больш умацуецца матэрыяльнае і фінансавае становішча. Будаўніцтва вядзецца цалкам за ўласныя сродкі. Мяркуецца яго запусціць сёлета. Жывёлабойную лінію набылі праз «Прамаграліізінг» пад два працэнты гадавых. Спадзяёмся, што будзе нейкая дапамога па халадзільным абсталяванні. А далей будзем глядзець, куды рухацца, за што брацца ў першую чаргу.

На працягу апошніх шасці гадоў прадпрыемства працуе рэнтабельна, выконвае ўсе даведзеныя прагнозныя паказчыкі. Летась выпушчана прадукцыі на 4,2 мільёна рублёў, дынаміка ў супастаўных цэнах склала 107,2 % пры прагнозе 103,5 %. У параўнанні з папярэднім 2017-м выраблена прадукцыі на 0,4 мільёна рублёў больш. За мінулы год выпуск прадуктаў з мяса (каўбасныя вырабы, мясныя паўфабрыкаты) склаў 459 тон, для чаго перапрацавана больш за 520 тон мяса на костцы. Сыравіна атрымана на сваёй забойнай пляцоўцы. Штомесяц прадпрыемства выпякае больш за 81 тону хлебабулачных і мучных кандытарскіх вырабаў. На гэтыя мэты летась зрасходавана 650 тон муні.

Сярэднямесячная заработная плата ў «Кааппраме» — 622 рублі. Тэмп росту адносна 2017-га — 117,7 %. На аднаго працуючага даводзіцца больш за 94 тысячы рублёў выручкі ад рэалізацыі.

За дванаццаць месяцаў 2018-га атрымана 160 тысяч рублёў чыстага прыбытку, рэнтабельнасць чыстага прыбытку — 2,56 % (прагноз 1,8 %), рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 6,83 % пры прагнозным паказчыку — 4,0 %.

Уласныя абаротныя сродкі з улікам доўгатэрміновых крэдытаў на пачатак гэтага года — у памеры 918 тысяч рублёў.

Здавалася б, пры такіх паказчыках, фінансава-эканамічным становішчы можна і перавесці дыханне. Але на прадпрыемстве разумеюць, што на пятікі наступаюць канкурэнты, што ў сучасных жорсткіх рыначных умовах змогуць выжыць і захаваць сваё месца на рынку толькі найманцнейшыя, ініцыятыўныя, творчыя, крэатыўныя. Таму кіраўніцтва, калектыў «Кааппрама» знаходзяцца ў пастаянным пошуку, распрацоўваюць новыя віды прадукцыі, займаюцца пашырэннем асартыменту, каб захаваць сваю нішу на рынку, утрымаць пастаянных і прыцягнуць новых пакупнікоў. Напрыклад, у адным з магазінаў суседняга Слуцка правялі своеасаблівы тэст — выстаўку-дэгустацыю прадукцыі. Случчане ацанілі яе смакавыя якасці. У выніку нашмат павялічылася колькасць заявак на здобныя і булачныя вырабы. Калі некалькі гадоў таму большасць прадукцыі кааператыўнай прамысловасці рэалізавалася праз Капыльскае райспажыўтаварыства, то цяпер тут знаходзяць рынкі збыту па ўсёй Мінскай вобласці, спрабуюць выходзіць за яе межы. У тым ліку і па-за сістэмай спажыўкааперацыі. Прадпрыемства стала больш цесна і паспяхова супрацоўнічаць са сталічнымі магазінамі, фірмовымі крамамі агракамбіната «Дзяржынскі». Прадукцыя дастаўляецца спажыўцам аўтамабілямі, аснашчанымі халадзільным абсталяваннем. Заключаны дагаворы з індывідуальнымі прадпрымальнікамі на пастаўку хлебабулачных вырабаў.

— Мы пастаянна абнаўляем іх асартымент. Параўноўваем з асартыментам хлебазаводаў. Інакш, спаборнічаем, каб нашы хлебабулачныя вырабы купілялі больш, каб яны былі смачныя. Мы адсочваем усе пазіцыі па якасці, цане, аналізуем аб'ёмы спажывання, — кажа Тамара Абрамовіч. — Хлебазаводаў у сістэме спажыўкааперацыі Мінскай вобласці засталося мала, не ўсе вытрымліваюць канкурэнцыю. Вядома, спаборнічаць цяжка, але тым не менш мы працуем і маем прыбытак, таму што ўвесь час удасканальваемся, шукаем новыя віды прадукцыі. Свежамарожаную рыбу, напрыклад, закупляем у надзейных, правераных кампаній, якія спецыялізуюцца на яе пастаўках. Засольваем селядца, кільку, вэндзім мойву, скумбрыю. У планах — марынаваць марскую капусту, цяпер працуем над дакументамі.

Летась у «Кааппраме» пачалі выпускаць навінкі, якія прыйшліся даспадобы пакупнікам. Гэта цукровыя казінакі «Фларэнта» двух відаў, «Саладосці для радасці», батон «Колас», багет «Сталічны» з падоўжаным тэрмінам захоўвання, булачкі: з начынкай «Ладачка», «Апетытная з вішняй», «Апетытная». На працягу апошніх шасці гадоў хлебабулачная прадукцыя займае прызавыя месцы на рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў. Так, летась на конкурсе «Смаката-2018» золата атрымалі хала «Літоўская» і казінакі «Фларэнта», серабро — здоба «Фруктовы сюрпрыз», бронзу — батон «Вячэрні».

Ацанілі спажыўцы таксама мясныя каўбаскі «Кабаносы «Варшаўскія», салямі «Залацістая». На прадпрыемстве імкнуцца, каб кожны выраб быў не проста натуральны, а нагадваў смак дзяцінства. Каб быў такі, як яго гатавалі нашы бабулі ў вёсцы.

— Для вытворчасці каўбас выкарыстоўваецца толькі ахаладжанае мяса, да таго ж, у натуральнай абалонцы. Сыравіна праходзіць абавязковае дэкларыраванне з правядзеннем усіх неабходных выпрабаванняў адпаведна нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі ў рэгіянальным цэнтры ў Слуцку. На прадпрыемстве праводзіцца належны лабараторны кантроль на ўсіх этапах вытворчасці. Таму наша прадукцыя бяспечная, — упэўнена Тамара Міхайлаўна.

Дадам, што апошнім часам прадпрыемства асвоіла выпуск неўласцівай для харчовай прамысловасці прадукцыі — сеткі рабіцы і драцяных цвікоў, што дазволіла ў цэлым патаніць кошт выпускаемых тавараў.







▲ Апрацоўшчык Валянціна БОЙКА сочыць за гатоўнасцю рыбы ў камеры халоднага вэнджання.

◄ Работніца каўбаснага цэха Наталля КАСКО аглядае сыравэнджаную салямі «Залацістая».

► Якасць сыравіны вызначае лабарант хіманалізу Наталля СТАРАВЕРАВА.

Стабільнае прадпрыемства, значыць, стабільны калектыў. Як кажуць, ад добрага лепшага не шукаюць. Цякучасці кадраў няма. «Мы жывём, як адна дружная сям'я, — канстатуе дырэктар. — Да ўсіх дзяржаўных свят, Дня работніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, Дня кааператара даём сваім працаўнікам прэміі або прадуктовыя наборы, купляем абанементы ў фізкультурнааздараўлены комплекс.

«Кааппрам» мае два фірмовыя магазіны. Адзін, які ў народзе называюць «Гарачы хлеб», знаходзіцца побач з камбінатам. І ён цалкам апраўдвае нефармальную назву, бо тут заўсёды можна набыць хлеб, выпечку, што называецца, з полымя, з жару. Добра раскупляецца і свежае мяса, каўбасныя, кандытарскія вырабы, здоба ўласнай вытворчасці ды іншыя спадарожныя прадукты. Ніколі не пустуе і магазін, што знаходзіцца ў самім горадзе. Адбою ад кліентаў няма.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**



Хлеб «Святлічны» — духмяную, свежаспечаную прадукцыю рыхтуюць да адпраўкі ў магазіны пекар Наталля РЫМАШЭЎСКАЯ і цестамес Лілія ЛАГОДЗІЧ.

УНП 600018599

# А МУЗЫКА ГУЧЫЦЬ...

## Мы разам — Беларусь

### Узорны аркестр — гонар дзіцячай школы мастацтваў

**Капыльскай дзіцячай школе мастацтваў сёлета споўніцца 55 гадоў.**



— Наша ўстанова вядзе адлік сваёй гісторыі з 1964 года. Выхаванцы навучаюцца па чатырох кірунках: музычнае, харэаграфічнае, выяўленчае і народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, — падзяліўся звесткамі **дырэктар Уладзімір ЧАРКАС.** — Гонар нашай школы — узорны эстрадны аркестр. Яго стваральнік і нязменны кіраўнік Леў Канаплянік. Шмат дзяцей прайшло школу Льва Міхайлавіча з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі быў заснаваны гэты калектыў.

Гэты ўнікальны аркестр добра ведаюць не толькі ў раёне, але і ў Мінскай вобласці, краіне. Не выпадкова яго **кіраўніку Льву КАНАПЛЯНІКУ** прысвоілі званне «Чалавек года Міншчыны — 2018». Увесь свой час, энергію, вопыт выкладчык аддае дзецям, рабоце, школе.

— Мне эстрадная музыка падабалася з дзяцінства, яшчэ ў школе ўдзельнічаў у вакальна-інструментальным ансамблі, ігралі на вечарах. Радасна было глядзець, як хлопцы запрашалі дзяўчат у белых фартухах на танец. Гэта было прыгожа, грацыёзна, — кажа мой суразмоўнік.

Такі калектыў існаваў і ў школе мастацтваў. Пасля прыходу Льва Канапляніка ён памяняў назву. Паступова сюды ўводзіліся скрыпкі, затым — духавыя інструменты. З кожным годам ён расшыраўся, і цяпер гэта вялікі аркестр з поўнай групай духавых інструментаў. Дзеці займаюцца з задавальненнем, ім цікавыя калектыўнае музіцыраванне, зносіны з равеснікамі.

Але спецыфіка калектыву ў тым, што дзеці вырастаюць і сыходзяць, пастаянна даводзіцца рыхтаваць замену. А гэта доўгі, карпатлівы працэс. Падбіраць адораных выхаванцаў для аркестра дапамагаюць выкладчыкі школы, і з цягам часу дзеці вырастаюць у сапраўдных музыкантаў.

**Аркестр двойчы станавіўся ўладальнікам Гран-пры конкурсу Jazz-Time, лаўрэатам розных ступеняў, у 2018 годзе заваяваў дыплом I ступені. Гэты конкурс праводзіцца ў Салігорску адзін раз на два гады і вельмі папулярны сярод джазавых музыкантаў не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны.**

— Мы ўдзельнічалі ў мінулым годзе ў гэтым конкурсе ўжо сёмы раз. — З кожным годам яго геаграфія расшыраецца, а ўзровень выканаўцаў узрастае. Мы доўга і карпатліва рыхтаваліся да гэтай падзеі. Для нас такія мерапрыемствы — добры стымул для работы, а сам удзел дае цудоўны вопыт, — упэўнены Леў Канаплянік.

Дадам, што калектыў — неаднаразовы ўдзельнік абласнога фестывалю «Напеў зямлі маёй», які ладзіцца ў Пухавіцкім раёне, дзе таксама заваяваў Гран-пры. Літаральна мінулай восенню на гэтым фестывалі аркестр атрымаў дыплом I ступені. Заўсёды з радасцю прымаюць салігорскіх музыкаў і на фестывалі «Свята саксафона», што праводзіцца на базе Маладзечанскай дзіцячай школы мастацтваў. Чатыры разы яны ўдзельнічалі ў ім і вярталіся дадому з дыпломам I ступені.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Спытайце пра радзіннае

# Ці можна садзіць елку побач з хатай?

**Спадарыня Ляшковіч Т. М. з Мінска задае такое пытанне: «Ці могуць елкі, якія растуць каля плота вакол хаты, пашкодзіць здароўю».**

Елка — дрэва, вакол якога ў беларусаў і іншых славянскіх народаў сфарміравалася шмат супярэчлівых уяўленняў. Яна заўсёды стаяла ў пэўным сэнсе асобна, таму што **ў славянскіх народаў лічылася негатыўным дрэвам, дрэвам-энергавампірам.** Нават само яно «сканструявана» прыродай так, што самыя вялікія галіны знаходзяцца знізу, каля самай зямлі, тым самым як быццам адштурхоўваюць (адганяюць) чалавека ад сябе, не даючы дакрануцца да свайго ствала.

Елку, жывую або штучную, нясуць перад Новым годам у хату, упрыгожваюць, ператвараючы ў галоўны атрыбут навагодніх імпрэз. Людзі старэйшых пакаленняў памятаюць, што калісьці лапкамі елкі «пракладалі», г. зн. маркіравалі дарогу ад парога хаты, у якой памёр чалавек, да варот могілак. Хтосьці ўспомніць елку невялікага памеру, якая стаяла на вясельным стале перад маладымі на працягу ўсяго вяселля.

Елка была часткай сімволікі пераходу з аднаго сацыяльнага статусу ў іншы: і ў вясельным абрадзе, калі маладыя «памiралі» як хлопец і дзяўчына і «нараджаліся» як муж і жонка, і ў кантэксце пахавальнага абраду — як сімвал шляху чалавека з гэтага на «той» свет. Нават труну часцей за ўсё выраблялі з яловых дошак. Пахавальныя вянкі, гірлянды, якія неслі перад труной з памерлым, таксама збіраліся з яловага лапніку. І навагодняя елка, па сутнасці, сімвалізуе «паміранне» старога года і нараджэнне новага.

Зыходзячы з вышэйсказанага, не дзіва, што ў разгорнутай, адпрацаванай стагоддзямі сістэме забарон і абмежаванняў, рэгламентацый і прадпісанняў з'явілася і **забарона саджаць на тэрыторыі сваёй сядзібы елку.**

У нас сабрана нямала ўспамінаў старых, а таму мудрых сваім жыццёвым досведам людзей пра тое, як елка, пасаджаная каля хаты, «выжывала» (у сэнсе выцясняла) у літаральным і пераносным сэнсе дамачадцаў: «сям'я выкараніцца». І ў першую чаргу гэта датычылася мужчын: «мужыкі не будуць жыць, паміраць будуць, адны ўдовы будуць». Лічылася, што пасаджаная паблізу хаты елка не дазволіць нараджацца хлопчыкам. Акрамя таго, **нашы продкі ўладкоўвалі сваю сядзібу па прынцыпе падабенства (падобнае выклікае падобнае), а таму ніколі не саджалі на яе тэрыторыі непладовыя дрэвы, «інакш у хаце, у гародзе нічога не будзе весціся», а значыць, можна застацца бяздзетнымі. Адным словам, «не будзе шчасця ў двары»...**

І наадварот, да гэтага часу існуе міжнародная традыцыя саджаць алеі памяці ў гонар ахвяр вайны, прыродных анамалій. І тут **«дрэвам вечнай памяці», як правіла, становіцца елка.** Дакладнае ўвасабленне гэтай традыцыі мы сустракаем у Маскве на Краснай плошчы. Так званы некропаль памяці адмежаваны ад свету жывых сцяной блакітных елак.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».


## МОГИЛЕВСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ **13.03.2019** ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 13 марта 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 12 марта 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за пять дней до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод», УНН 700103211, Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Набережная,10

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, **тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25**

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение пяти календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Установленная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС 20 %) согласно законодательству Республики Беларусь. Оплата предмета аукциона будет производиться на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона. Победитель аукциона возмещает стоимость затрат на проведение оценки имущества в размере 15,79 бел. руб. с учетом НДС за один лот на условиях заключенного договора купли-продажи

Шаг аукциона: 5 % от начальной цены соответствующего лота. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %. Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 29.08.2018 и 22.11.2018

### Объекты продажи

| № Лота | Наименование имущества | Цена продажи без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | № Лота | Наименование имущества | Цена продажи без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лоты № 1-10 | Бродильный чан | 1 292,00 | 129,20 | Лот № 161 | Машина бутылкомоечная АММ6 СЗП | 32 220,00 | 3 222,00 |
| Лот № 11 | Вакуумпрерыватель | 59,87 | 5,99 | Лот № 162 | Машина бутылкомоечная БЗ -АМЕ6 | 16 110,00 | 1 611,00 |
| Лот № 12 | Вакуумпрерыватель | 3 390,70 | 339,07 | Лот № 163 | Машина фасов. для пищев. жидкостей Д9-ВРЕ-6 | 888,96 | 88,90 |
| Лоты № 13-21 | Дрожжанка | 1 451,39 | 145,14 | Лот № 164 | Насос EFI-3 | 984,75 | 98,48 |
| Лот № 22 | Дрожжевая линия | 568,44 | 56,84 | Лоты № 165-166 | Насос F 40/160 В | 419,47 | 41,95 |
| Лоты № 23-24 | Емкость для спирта гор. | 752,09 | 75,21 | Лот № 167 | Насос вакуумный | 616,48 | 61,65 |
| Лот № 25 | Емкость для хранения серной кислоты | 312,81 | 31,28 | Лот № 168-169 | Насос вакуумный УВД 10000А | 131,37 | 13,14 |
| Лот № 26 | Емкость пром. вод. спирт | 149,92 | 14,99 | Лоты № 170-175 | Насос Ж6 ВНП-10/32 | 1 075,88 | 107,59 |
| Лот № 27 | Емкость со шнеком | 3 122,76 | 312,28 | Лот № 176 | Насос К-20-30 | 141,44 | 14,14 |
| Лот № 28 | Компрессор | 5 808,87 | 580,89 | Лот № 177 | Насос К-80-65-160 | 199,13 | 19,91 |
| Лот № 29 | Линия подачи бражки | 579,38 | 57,94 | Лот № 178 | Насос К-80-65-160 | 377,79 | 37,78 |
| Лот № 30 | Линия подачи сусла в дрожжанку | 720,94 | 72,09 | Лот № 179 | Насос К-90/20 | 251,21 | 25,12 |
| Лот № 31 | Насос HPS 32-80 | 293,33 | 29,33 | Лот № 180 | Насос центробежный г2-опд инв. 369КБ | 257,62 | 25,76 |
| Лот № 32 | Насос АПВ 125 | 1 606,44 | 160,64 | Лот № 181 | Пресс ВТШ-5 | 8 800,66 | 880,07 |
| Лот № 33 | Насос АХ 50-32 | 684,95 | 68,50 | Лоты № 182-183 | Резервуар вертикальный РВ-40 | 3 089,59 | 308,96 |
| Лот № 34 | Насос ФГПО 120 75 1500 | 881,54 | 88,15 | Лоты № 184-185 | Резервуар вертикальный РВ-40 | 3 035,20 | 303,52 |
| Лот № 35 | Насос ФГПУ 120;16 | 442,54 | 44,25 | Лоты № 186-189 | Резервуар горизонтальный РВ-0,7-50 | 4 170,47 | 417,05 |
| Лот № 36 | Насос центробежн. | 627,87 | 62,79 | Лоты № 190-201 | Резервуар эмал гориз Л4-ВХ2-Г-16 (брод) | 608,05 | 60,81 |
| Лоты № 37-38 | Насос центробежн. | 1 606,44 | 160,64 | Лот № 202 | Рефрактометр УРЛ | 490,64 | 49,06 |
| Лот № 39 | Насос центробежный АНС-60 | 237,19 | 23,72 | Лоты № 203-206 | Сахаромешалка | 498,42 | 49,84 |
| Лоты № 40-41 | Разварник | 9 053,25 | 905,33 | Лот № 207 | Станок токарный 1к62 | 1 543,75 | 154,38 |
| Лот № 42 | Электронасос ЭЦВ 82510 | 412,21 | 41,22 | Лоты № 208-209 | Фильтр-пресс для отжима соков и вин Ш4 ВФП12 | 1 250,00 | 125,00 |
| Лот № 43 | Электронасос ЭЦВ 82510 | 253,67 | 25,37 | Лот № 210 | Центрифуга ОПН-8-УН-2 | 230,51 | 23,05 |
| Лот № 44 | Электронасос ЭЦВ погружной | 412,21 | 41,22 | Лот № 211 | Этикетировочный автомат ВЭМ | 4 622,57 | 462,26 |
| Лот № 45 | Бражная колонна | 17700,23 | 1770,02 | Лот № 212 | Агрегат электронасосный АХ-50-32-160 КСД | 430,48 | 43,05 |
| Лоты № 46-49 | Дрожжанка | 833,34 | 83,33 | Лот № 213 | Брагоперегон аппарат БК.00.000-02 | 4 198,29 | 419,83 |
| Лот № 50 | Емкость для спирта | 1 306,39 | 130,64 | Лот № 214 | Брагоперегонная колонна 800 | 26 113,22 | 2 611,32 |
| Лот № 51 | Емкость под кислоту, метал. | 1 169,96 | 117,00 | Лоты № 215-224 | Бродильный чан | 1 167,07 | 116,71 |
| Лоты № 52-53 | Емкость спиртовая инв. 59, 60 | 593,02 | 59,30 | Лоты № 225-229 | Дрожжанка инв. №№ 422-425 | 1 451,39 | 145,14 |
| Лот № 54 | Емкость спиртовая | 595,54 | 59,55 | Лот № 230 | Емкость 25 $м^3$ (водянка) | 857,47 | 85,75 |
| Лот № 55 | Емкость спиртовая | 876,21 | 87,62 | Лот № 231 | Емкость 25 $м^3$ для спирта-сырца | 2 328,44 | 232,84 |
| Лоты № 56-57 | Заторный чан | 1 041,67 | 104,17 | Лот № 232 | Емкость 25 $м^3$ для спирта-сырца | 588,28 | 58,83 |
| Лот № 58 | Мерник 250 дал | 2 288,28 | 228,83 | Лот № 233 | Емкость 27 $м^3$ для спирта-сырца | 637,82 | 63,78 |
| Лот № 59 | Мерник 250 дал | 1 594,41 | 159,44 | Лот № 234 | Емкость 28 м9 для ФП | 656,64 | 65,66 |
| Лоты № 60-61 | Мерник 75 дал инв. 36 | 496,04 | 49,60 | Лоты № 235-236 | Емкость 33 $м^3$ для спирта-сырца | 3 073,54 | 307,35 |
| Лот № 62-64 | Насос ассцл 20,24 центроб. вихрев | 1 198,60 | 119,86 | Лот № 237 | Емкость для хранения ФП | 606,15 | 60,62 |
| Лот № 65 | Насос нциф -100 | 1 051,62 | 105,16 | Лот № 238 | Емкость из нерж стали для серной кислоты | 342,67 | 34,27 |
| Лот № 66 | Насос CR 10-10F | 919,21 | 91,92 | Лот № 239 | Емкость нерж. 12,5 тыс. дал | 18 187,50 | 1 818,75 |
| Лот № 67 | Насос сд 32,40 | 299,77 | 29,98 | Лот № 240 | Компрессор ГСВ 06/12 | 289,42 | 28,94 |
| Лот № 68 | Насос цнс 38,176 | 1355,23 | 135,52 | Лот № 241 | Компрессорная установка | 6 836,70 | 683,67 |
| Лот № 69 | Насос цнст 138,88 | 620,85 | 62,09 | Лот № 242 | Насос 2ЭЦВ 8-25-110 | 412,21 | 41,22 |
| Лоты № 70-73 | Насос эцв 8-25-100 | 380,50 | 38,05 | Лот № 243 | Насос АСНВ-80 | 3 782,88 | 378,29 |
| Лот № 74 | Насос эцв 8-25-40 | 819,75 | 81,98 | Лот № 244 | Насос К-20-30 консольн | 131,19 | 13,12 |
| Лоты № 75-77 | Разварник инв. 201 | 9 985,57 | 998,58 | Лот № 245 | Насос НМШ 5-25 шестеренный | 323,37 | 32,34 |
| Лот № 78 | Реактор солераствор. | 880,02 | 88,00 | Лот № 246 | Насос НМШ 5-254,4, мазутный, шестереночн. | 299,74 | 29,97 |
| Лоты № 79-88 | Чан бродильный | 699,29 | 69,93 | Лоты № 247-248 | Насос НСЦЛ центробежный 20-24 | 1 198,60 | 119,86 |
| Лот № 89 | Чан из н/ж стали | 2 780,70 | 278,07 | Лот № 249 | Насос С Д 25/14 | 248,22 | 24,82 |
| Лот № 90 | Углекислотный баллон в количестве 428 шт. | 27 641,67 | 2 764,17 | Лот № 250 | Насос СМ 80-50-200-4 | 300,77 | 30,08 |
| Лот № 91 | СпиртоловушкаF= 10 $м^2$ | 2 701,28 | 270,13 | Лот № 251 | Насос СР 5-22А | 935,32 | 93,53 |
| Лот № 92 | Конденсатор F=10 кв. м | 2 755,00 | 275,50 | Лот № 252 | Насос центробежный К-45/30А | 162,43 | 16,24 |
| Лот № 93 | Авто розлива Е1ВРА6А | 19 645,90 | 1 964,59 | Лот № 253 | Насос ЦСНГ центробежный | 1000,89 | 100,09 |
| Лот № 94 | Автомат АИ-500 | 6 820,13 | 682,01 | Лоты № 254-255 | Насос Ш 40-18 шестеренный | 575,55 | 57,56 |
| Лоты № 95-97 | Автомат БАЗМ | 533,38 | 53,34 | Лоты № 256-257 | Насос ЭЦВ 8-25-100 | 412,21 | 41,22 |
| Лот № 98, 107 | Автомат для наклейки акцизных марок | 4 622,57 | 462,26 | Лот № 258 | Осахариватель (заторный чан) | 2 634,86 | 263,49 |
| Лот № 99-100 | Автомат для наклейки акцизных марок А07 | 5 689,31 | 568,93 | Лот № 259 | Осахариватель (заторный чан) | 1666,32 | 166,63 |
| Лот № 101 | Автомат марки ВЭМ | 4 622,57 | 462,26 | Лот № 260 | Разварник СП-1163 | 9 958,57 | 995,86 |
| Лот № 102 | Автомат розлива Т1ВНА12 | 39 291,80 | 3 929,18 | Лоты № 261-265 | Дрожжанка инв. №№ 136, 148-152 | 1 333,34 | 133,33 |
| Лот № 103 | Автомат укупорочный ТМ-3 Л5-ВУВ | 7 701,74 | 770,17 | Лот № 266 | Колонна бражная | 18 948,54 | 1 894,85 |
| Лот № 104 | Автомат укупорочный универс Л5-ВУВ | 4 286,03 | 428,60 | Лот № 267 | Компрессор | 384,03 | 38,40 |
| Лот № 105 | Автомат укупорочный универс ЛПМ-4-602в1 | 5 571,84 | 557,18 | Лот № 268 | Насос центробежный анс-60 | 280,32 | 28,03 |
| Лот № 106 | Автомат этикировочный | 3 911,40 | 391,14 | Лот № 269 | Насос цнсг 60-66 | 774,94 | 77,49 |
| Лот № 108 | Дробилка ВДР-5 | 1 145,84 | 114,58 | Лот № 270 | Насос асцп 20;24 | 998,83 | 99,88 |
| Лот № 109 | Емк.из нерж.стали | 4 103,85 | 410,39 | Лоты № 271-272 | Насос Комовского вакуумный | 44,78 | 4,48 |
| Лот № 110 | Емкость | 1 548,27 | 154,83 | Лоты № 273-274 | Насос нвп-125-2 | 1 592,12 | 159,21 |
| Лоты № 111-112 | Емкость V-25 $м^3$ | 2 124,14 | 212,41 | Лот № 275 | Насос центробежный нциф-100 | 1 468,24 | 146,82 |
| Лоты № 113-114 | Емкость V-50 $м^3$ из нерж стали | 3 419,87 | 341,99 | Лот № 276 | Насос эцв 8-25-100 | 380,50 | 38,05 |
| Лот № 115 | Емкость бродильная | 2 873,39 | 287,34 | Лот № 277 | Смеситель для замеса муки | 3 159,72 | 315,97 |
| Лот № 116 | Емкость бродильная | 4 063,06 | 406,31 | Лот № 278 | Холодильн. углекислоты | 692,87 | 69,29 |
| Лот № 117 | Емкость винная эмалир | 1 043,11 | 104,31 | Лот № 279 | Царга брагоперегонная | 1 985,40 | 198,54 |
| Лот № 118 | Емкость для спирта гор. | 2 294,08 | 229,41 | Лот № 280-288 | Чан бродильный | 1 336,81 | 133,68 |
| Лот № 119 | Емкость для спирта гор. | 3 488,27 | 348,83 | Лот № 289 | Чан солодовый | 448,43 | 44,84 |
| Лот № 120 | Емкость для спирта гор. | 4 103,85 | 410,39 | Лот № 290 | Выдерживатель | 3 028,64 | 302,86 |
| Лот № 121-122 | Емкость для спирта гор. | 2 294,08 | 229,41 | Лот № 291 | Теплообменник | 2 525,42 | 252,54 |
| Лот № 123 | Емкость для спирта гор. | 3 009,49 | 300,95 | Лот № 292 | Сепарат. углекислоты | 1 840,14 | 184,01 |
| Лот № 124-128 | Емкость из нерж.стали 50 $м^3$ | 16 685,24 | 1 668,52 | Лот № 293 | Труба медная МзР 32х2х5000 171,2кг. | 1 078,64 | 107,86 |
| Лот № 129 | Емкость эмалиров. | 621,87 | 62,19 | Лот № 294 | Труба медная МзР 45х2,5х5000 359,1кг. | 2 647,96 | 264,80 |
| Лоты № 130-152 | Емкость эмалиров. л-76 вч | 570,04 | 57,00 | Лот № 295 | Труба медная МзР 55х3х5000 1337,2кг | 7 920,30 | 792,03 |
| Лоты № 153-156 | Емкость эмалиров. ПЧВК21-16 | 722,06 | 72,21 | Лот № 296 | Труба медная МзР 155х2,5х5000 84кг | 709,04 | 70,90 |
| Лот № 157 | Емкость эмалиров. ПЧВК21-16 | 912,07 | 91,21 | Лоты № 297-298 | Дрожжанка | 285,75 | 28,58 |
| Лоты № 158-160 | Емкость эмалированная | 570,04 | 57,00 | Лот № 299 | Дрожжанка | 258,96 | 25,90 |
| Объекты продажи находятся на территории ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод» | | | | Лот № 300 | Теплообменник инв.194 | 177,29 | 17,73 |

# ДЛЯ БУДУЧЫХ МАМ

## Якія працэдуры неабходны, каб нарадзіць здаровае дзіця

**...32-гадовая жыхарка Жлобіна нарадзіла дзіця, дзяўчынка аказалася з сіндромам Даўна. Жанчына абвінавáціла ўрачоў у тым, што своечасова не выявілі парок развіцця, адмовілася ад дзіцяці ў раддоме, не жадае плаціць на яго ўтрыманне аліменты і збіраецца падаць на медыкаў у суд. Маўляў, з магчымасцямі сучаснай медыцыны гэта памылка цалкам на сумленні ўрачоў. Выпадак выклікаў вялікі рэзананс у СМІ. Ці ёсць імавернасць прапусціць прыроджаныя парокі развіцця, якія абследаванні павінна зрабіць цяжарная жанчына і чаму сіндром Даўна ў многіх краінах свету не з'яўляецца абавязковым паказаннем для перарывання цяжарнасці, мы распыталі ўрача з 34-гадовым стажам, гінеколага медыцынскага цэнтра «Ладэ» Марыю ВАРАБ'ЁВУ.**



***— Марыя Станіславаўна, якія аналізы дазваляюць выявіць прыроджаныя парокі?***

— Найперш біяхімічны скрынінг, які выконваецца на тэрміне ад 10 з паловай да 13 з паловай тыдняў цяжарнасці. Гэта аналіз крыві на вызначэнне альфа-фетапратэіну — асаблівага бялку, які выпрацоўваюць тканкі эмбрыёна. У кожны тэрмін цяжарнасці ён мае адпаведны ўзровень. І на названым тэрміне найбольшая імавернасць паставіць дакладны дыягназ. У Мінску для такога скрынінгу жанчына накіроўваецца ў перынатальныя цэнтры, якія працуюць на базе РНПЦ «Маці і дзіця», 2-га раддома і 1-й гарадской клінічнай бальніцы. Яна праходзіць ультрагукавую дыягностыку і біяхімічны скрынінг. Калі выяўляюцца рызыкі, жанчыну запрашаюць на дадатковае абследаванне. Рызыкі вызначае камп'ютарная праграма: яна аналізуе такія параметры, як узрост цяжарнай, біяхімічныя паказчыкі і даныя ультрагукавога даследавання. Нават калі паасобку паказчыкі ў межах нормы, у комплексе яны могуць сведчыць аб пэўнай небяспецы, пра што і паведаміць даследаванне. У такім выпадку жанчыне прапануецца прайсці амніяцэнтэз — атрыманне каляплодных вод для далейшага іх даследавання на наяўнасць маркёраў парокаў развіцця.

Трэба сказаць, што ў Беларусі біяхімічны скрынінг робяць усім цяжарным жанчынам, якія своечасова становяцца на ўлік да гінеколага. У некаторых краінах свету, напрыклад у Англіі, яго праходзяць толькі жанчыны з груп рызыкі, бо гэта нятанны аналіз.

***— Калі прайсці ўсе гэтыя працэдуры, ці ёсць рызыка прапусціць парокі?***

— Асабіста я не ведаю выпадкаў, калі б быў выкананы амніяцэнтэз, які не выявіў сіндрому Даўна, але нараджалася б дзіця з гэтым сіндромам. Не выключана, што можа развіцца іншая паталогія — за кошт інфекцыі ці, напрыклад, пнеўманіі, якія здарыліся падчас цяжарнасці. Гэта таксама будзе прыроджаная паталогія, але не генетычна дэтэрмінаваная.

***— Якія парокі, акрамя сіндрому Даўна, выяўляюцца падчас такіх абследаванняў?***

— Прыроджаныя парокі нервовай трубкі, а гэта ўся прыроджаная паталогія нервовай сістэмы, таксама сіндромы Эдвардса, Патау. Амніяцэнтэз дастаткова адчувальны і да іншых прыроджаных парокаў. Акрамя таго, да 22 тыдня цяжарнасці прызначаецца яшчэ адно ультрагукавое даследаванне, бо ёсць парокі, якія развіваюцца на раннім этапе, а ёсць тыя, што з'яўляюцца пазней — у працэсе росту плода. Іх можна ўбачыць у 20 тыдняў. Спецыяліст ультрагукавой дыягностыкі павінен быць вопытным прафесіяналам, дакладна ведаць, якую карціну на маніторы мае той ці іншы парок.

Што датычыцца сіндрому Даўна, то ва ўсім свеце ён не з'яўляецца абавязковым паказаннем да перарывання цяжарнасці. Бо ўжо прызнана, што такія дзеці жыццяздольныя, паддаюцца навучанню, не ўяўляюць небяспекі для грамадства. У многіх еўрапейскіх краінах, напрыклад у Швецыі, такія людзі нават працуюць.

***— Якія жанчыны знаходзяцца ў групах рызыкі?***

— Задача доктара, які назірае цяжарную, накіраваць яе на ультрагукавы і біяхімічны скрынінгі. І звярнуць увагу на тое, што іх абавязкова неабходна прайсці. А спецыяліст, які робіць УГД, сарыентуе жанчыну далей. У групе рызыкі па ўзросце — дзяўчаты да 18 гадоў уключна і жанчыны, старэйшыя за 35 гадоў. Ёсць групы рызыкі па паталогіі сэрца, калі ў жанчыны, яе блізкіх сваякоў ці ў мужа і яго сваякоў былі парокі сэрца, прыроджаныя анамаліі. Жанчынам з груп рызыкі абавязкова робіцца амніяцэнтэз.

Сёння, дарэчы, з'явіліся цэнтры, якія абследуюць на розныя генетычныя паталогіі, праводзяць так званы генетычны аналіз крыві. Такое даследаванне дазваляе ацаніць стан храмасом, выявіць у іх пашкоджанні ці анамаліі і вызначыць дастаткова вялікі пералік паталогій. Гэта абследаванне можа замяніць амніяцэнтэз. Нягледзячы на тое, што ў дзяржаўных установах генетычны аналіз крыві не робіцца, яго вынікі прымаюць да ведама ў жаночых кансультацыях. Даследаванне нятаннае, і не кожны можа яго сабе дазволіць, гэта і не заўсёды патрэбна. Але гэта альтэрнатыва амніяцэнтэзу.

***— Падводзячы вынік, пералічыце абследаванні, якія павінна прайсці жанчына, калі хоча нарадзіць здаровае дзіця?***

— Спачатку трэба своечасова стаць на ўлік па цяжарнасці — да 12 тыдняў. Пры гэтым жанчына здае шэраг клінічных аналізаў, кансультуецца ў розных спецыялістаў. Важна, каб яна была здаровай. Калі ёсць нейкія хваробы, трэба выявіць, у якой яны ступені і які ўплыў могуць аказаць на цяжарнасць. У скрынінгавыя тэрміны жанчыну накіроўваюць у перынатальны цэнтр. Па выніках скрынінгу яна атрымлівае заключэнне з далейшымі рэкамендацыямі. Калі няма неабходнасці накіроўваць генетыкаў паўторна і рабіць амніяцэнтэз, то яна назіраецца ў сваёй кансультацыі ці прыватным медыцынскім цэнтры. Паўторную ультрагукавую дыягностыку цяжарная праходзіць да 22 тыдняў. У 28 тыдняў жанчыне могуць прызначыць дадатковую доплерографію, а ў тэрміны з 34 да 36 тыдняў праводзіцца абавязковае трэцяе УГД, дакладней ультрагукавая доплерографія: абследуюцца стан плода, плацэнтарныя цячэнні крыві, высвятляецца, ці дастатковая колькасць крыві паступае да плода, ці няма парушэнняў фетаплацэнтарнага цячэння крыві, як функцыянуе плацэнта. Па гэтых параметрах можна зрабіць выснову, ці правільна развіваецца дзіця. Гэта працэдура не прадугледжвае выяўлення парокаў, бо яны павінны быць знойдзены ў ранніх тэрмінах. Яна ставіць за мэту выявіць стан плода. Канешне, і на гэтым этапе нельга выключыць паталогію, але яна звязаная з ускладненнем цяжарнасці, калі ў жанчыны назіраецца, скажам, высокі артэрыяльны ціск, імклівы набор вагі, ацёкі, нізкі гемаглабін. Гэта ўсё мае наступствы: плацэнта таксама ацякае, не праводзіць неабходную колькасць крыві, багатай на кісларод, дзіця можа пакутаваць ад гіпаксіі — нястачы кіслароду, ці недахопу харчавання.

# АД ШОКУ ДА АДРАДЖЭННЯ



## ЯК ПЕРАЖЫЦЬ СТРАТУ?

**Усе мы рана ці позна сутыкаемся ў сваім жыцці са стратамі: развод, расставанне з каханым чалавекам, звальненне з працы, цяжкая хвароба, страта ранейшага сэнсу свайго існавання і, безумоўна, смерць блізкіх. Здаецца, свет разбурыўся, і мы задаём сабе пытанні: «За што мне гэта?», «Чаму гэта здарылася са мной?», «Навошта мне жыць далей?».**

— Асноўным ядром псіхалагічнага перажывання з'яўляецца менавіта страта, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля СЯДАЧ.** — Мы жывём у свеце, дзе ўсё калісьці заканчваецца. Гэта данасць нашага існавання. Людзі паміраюць, адносіны заканчваюцца, нешта губляецца. І гэта натуральна — неяк рэагаваць на страту. Было б дзіўна, калі б нехта, страціўшы блізкага, не пакутаваў. Для таго каб чалавек правільна і не разбуральна для сябе перажыў гора, ён павінен разумець, што само гора і пакуты ў ім — гэта таксама частка жыцця.

Існуюць нават паняцці нармальнага гора і паталагічнага. І вось апошняя форма гаравання — гэта «завязнуць» на нейкай стадыі. І тут важна звяртацца да спецыялістаў — псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў — па дапамогу.

Традыцыйна вылучаюць чатыры асноўныя этапы гаравання. Першы — **шок ці анямене,** калі чалавек даведваецца аб сваёй страце. Гэта першая рэакцыя, якая выступае ў якасці абароны арганізма, каб уся жудасць ад таго, што здарылася, не абрынулася на псіхіку і не раздавіла яе. Гэта самы кароткі этап, які доўжыцца ад некалькіх хвілін да некалькіх дзён, як правіла, не больш за дзевяць. У гэты перыяд наша свядомасць адмаўляецца верыць. Чалавек альбо знаходзіцца ў ступары, проста застывае, у яго няма мімікі і слёз (замарожаны стан), альбо, наадварот, пачынае вельмі актыўна дзейнічаць. Часцей за ўсё гэта арганізацыйная праца па пахаванні ці нейкая іншая кіпучая дзейнасць, якая хавае пад сабой пакуль яшчэ не праяўленае перажыванне. Яно ўтрымліваецца гэтай актыўнасцю і пакуль не выйшла вонкі. На першым этапе нельга казаць пра нейкае ўсведамленне страты. Чалавек разумее, што нешта здарылася, але ўнутры пакуль прызнання няма. І на гэтым этапе важна не прымаць ніякіх важных рашэнняў, проста разумець, што гэты стан, хутчэй за ўсё, доўга не працягнецца. У гэты час нельга заставацца аднаму, нехта абавязкова павінен быць побач.

Потым пачынаецца наступны этап — **адмаўленне ці адхіленне.** Гэта этап, які ў норме доўжыцца 40 дзён. Часцей за ўсё чалавек кажа сабе такія словы: «Я не магу ў гэта паверыць, гэта не павінна было здарыцца». Гэта перыяд, калі немагчыма пакуль прызнаць той факт, што страта адбылася. Чалавек можа адчуваць слабасць, знясіленне, парушэнне сну (бяссонніцу ці санлівасць), немагчымасць выконваць звыклыя справы, чаканне, што памерлы вернецца.

Наступны этап — **прызнанне і боль.** Гэта самы цяжкі працэс ва ўсім гараванні. Тут пачынаюцца самыя вялікія пакуты, калі мы прызнаём, што страта ёсць, яна рэальная, і імкнёмся неяк ужыцца са сваёй сітуацыяй. У гэты час чалавек можа пакутаваць ад цэлай гамы пачуццяў: крыўда, віна, сорам, душэўны боль і іншыя. Часцей за ўсё менавіта на гэтым этапе можа праявіцца агрэсія (як супраць сябе, так і супраць іншых), можа развіцца дэпрэсія.

— Лічыцца, што падчас дэпрэсіі чалавек перажывае разбурэнне ўнутранага свету, — кажа Наталля Сядач. — Няправільнае перажыванне гора і вядзе да дэпрэсіі. І ў выніку, калі распазнанне спазняецца, дэпрэсія можа прывесці як да яўнага суіцыду, так і да схаванага, які ў народзе называюць «смяротнай тугой».

Прызнанне болю доўжыцца ад трох да шасці месяцаў, хоць гэта вельмі індывідуальна. Яно можа цягнуцца і год, калі чалавек рухаецца па шляху прызнання сітуацыі, але зноў адкочваецца ў нежаданне адпускаць свайго блізкага. Гэта самы цяжкі перыяд у працэсе гаравання, і ад яго людзі больш за ўсё хочуць пазбавіцца. І часта кажуць, што раней, калі не верыў у страту, было лягчэй жыць, але гэта ілюзія не мае нічога агульнага з рэальнасцю. І тут важна асэнсаваць: або мы пакутуем і застаёмся ў рэальнасці і тым самым маем шанц ісці далей у гэтым жыцці, або мы застаёмся ў ілюзіі і таксама пакутуем.

— Увогуле, любы пераход на наступны этап можа быць толькі пры адной умове: калі ты яго пражыў, — тлумачыць спецыяліст. — А каб нешта перажыць, трэба гэта перажываць, каб адгараваць, трэба гараваць. Іншых варыянтаў няма. Часта сваё гора людзі хочуць заглушыць, пазбавіцца ад яго хутчэй, але гэта не садзейнічае добраму перажыванню страты. Тое, што заглушаецца, застаецца ўнутры і ў нейкім выглядзе жыве. Пры нармальным перажыванні гора, калі чалавек беражліва да сябе ставіцца, боль паціху павінен сыходзіць.

Падчас пакут мы знясілены, і таму важна беражліва да сябе ставіцца — як клапатлівая маці да дзіцяці. Калі хочацца паспаць — трэба дазваляць сабе гэта. Хочацца паленавацца — даць сабе такую магчымасць і не караць сябе за лянoту. Такая беражлівасць да сябе і аднаўляе сілы.

І калі вы прайшлі праз увесь боль, наступае чацвёртая стадыя — **прыняцця ці адраджэння.** Гэта час, калі чалавек не проста прызнае той факт, што страта здарылася, але і кажа сабе: «Гэта здарылася ў маім жыцці, і я іду далей».

— Праскочыць праз усе гэтыя этапы немагчыма, можна толькі зрабіць выгляд, што іх няма. Тады яны паселяцца ўнутры і будуць жыць разам з чалавекам, напрыклад у выглядзе псіхасаматычных праяў, — кажа Наталля Сядач.

Заўсёды важна памятаць, што ўсё праходзіць і гора — таксама. І гэта дае сілы яго пераадолець. Таму трэба напамінаць сабе: «Я зараз перажываю гора, і пакутаваць у гэты час — нармальна», «Я не заўсёды буду адчуваць сябе так, як зараз». Пакуты і гора не забіваюць чалавека. Гэта цяжка, але гэта можна перажыць.

# «Дзякуй за любоў... Ніякага смутку і суму»

## Эмоцыі «Гонкі легендаў» і провады чэмпіёнак з вялікага спорту






**У панядзелак «Раўбічы» былі агорнуты вясновым сонцам і атмасферай свята. Культурная праграма «Гонкі легендаў» пачалася ў абед — гэта час нефармальных зносін аматараў біятлона са сваімі кумірамі. Беларусы атрымлівалі аўтографы, фатаграфаваліся, а пасля заядалі свае ўражанні смачнай ежай і запівалі гарачай гарбатай.**

Стадыён спарткомплексу ажывіўся бліжэй да вечара, спартыўная частка фестывалю адкрыла гонка з масавага старту сярод жанчын. Тут сустрэліся старыя саперніцы і сяброўкі — Ганна Багалій, Сімона Хаўсвальд, Алена Зубрылава. Перамогу ж у сваім бліскучым стылі атрымала Надзея Скардзіна. *«Выдатная падтрымка гледачоў дапамагла мне добра справіцца ў забегах,* — падзялілася Надзя пасля фінішу. — *Я старалася парадаваць гледачоў і рада, што ўдалося перасекчы фініш першай. У «Раўбічах» выдатнае свята, якое паказвае, наколькі любяць гэты від спорту ў Беларусі. Акрамя таго, сёння ў нас адбылася сустрэча з юнымі біятланістамі, для падрастаючага пакалення зносіны з зоркамі сусветнага спорту — добры стымул працаваць больш, каб паўтарыць, а можа, і перасягнуць іх поспех»*.

У мужчынскай гонцы з масавым стартам, якая працягнула праграму, на п'едэстал узняўся ўкраінец Андрэй Дзярызямля, які змог апярэдзіць «караля» біятлона Уле-Эйнара Б'ёрндалена і беларускага прызёра Алімпіяды ў Ванкуверы Сяргея Новікава.

«Разыначка» на торце, адзін з самых відовішчных відаў сучаснага біятлона — змешаная эстафета, была запланавана арганізатарамі напрыканцы. Барацьба за перамогу там разгарнулася паміж, мабыць, самым зорным дуэтам Дар'і Домрачавай і Уле-Эйнара Б'ёрндалена і беларускай парай Надзея Скардзіна/Сяргей Новікаў. Лёс узнагарод, як і належыць па самым захапляльным сцэнарыі, вырашыўся на заключнай стральбе. Скардзіна і Новікаў атрымалі перамогу, але Уле і Даша не былі засмучаныя. *«Як заўсёды, «Гонка легендаў» атрымалася прыемным, кранальным мерапрыемствам. Гэта сапраўднае свята біятлона. Тут сабраліся людзі, якія пісалі гісторыю нашага віду спорту, а на трыбунах — сапраўдныя знатакі біятлона. Дзякуй ім вялікі за гэтую любоў да нашага спорту, за любоў да нас і за падтрымку»*, — сказала Дар'я.

Завяршыўся фестываль провадамі з вялікага спорту алімпійскіх чэмпіёнак Дар'і і Надзеі. Дзеля гэтых імгненняў ніхто не сыходзіў з трыбун раней. Прамаўляючы словы падзякі балельшчыкам, дзяўчаты ледзьве стрымлівалі слёзы, хоць Даша адзначыла: *«Абсалютна няма ніякага суму, ніякага смутку. Гэта, напэўна, больш балельшчыкі сумуюць. А ў мяне ў планах шмат праектаў, жыццё працягваецца і спортам не абмяжоўваецца»*.

А пасля ўсе ўбачылі дзівоснае лазернае шоу, прысвечанае дзяўчатам, і вялікі феерверк. Яны гэта заслужылі!

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

### КАМЕНТАРЫІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ:

**Алімпійскі чэмпіён Сяргей ЧЭПІКАЎ:**

— Хтосьці завяршыў кар'еру 2-3 гады таму, а хтосьці не выступае ўжо 10-15 гадоў, таму сёння адчувалася розніца ў класе, але гэтыя спаборніцтвы праводзяцца не для ўзнагарод, а дзеля магчымасці зносін з гледачамі, а таксама гэта выдатная магчымасць сустрэцца з даўнімі сапернікамі.

**Прэзідэнт Саюза біятланістаў Расіі Уладзімір ДРАЧОЎ:**

— Ад «Гонкі легендаў» атрымліваю задавальненне і адчуваю радасць ад вяртання да сваіх сяброў, з кім тут бегаў шмат гадоў таму. Стадыён «Раўбічы» вельмі абнавіўся: добрыя трасы, стрэльбішча, ён варты найлепшых пахвал. Тут створаны выдатныя ўмовы для правядзення міжнародных стартаў.

**Прызёр чэмпіянатаў свету Андрэй ДЗЯРЫЗЯМЛЯ:**

— У Беларусі зрабілі сапраўднае спартыўнае свята, тым больш я рад, што ўдалося перамагчы. Прыйшлося бегчы ў кампаніі сур'ёзных сапернікаў і атрымалася апярэдзіць самога Б'ёрндалена. Арганізацыя на «Гонках легендаў» проста шыкоўная, да спорту ў вас у краіне ставяцца сур'ёзна і ўдзяляюць атлетам шмат увагі.





Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.








# НА МУЗЫЧНЫХ ПРЫПЫНКАХ






Непрыкметна, але трывала выразы «музыка ў падземцы» альбо «вулічныя музыканты» ўвайшлі ў нашу паўсядзённую гаворку і запоўнілі да таго заўрбанізаванае жыццё. Жыхары сталіцы ўжо ані не здзіўляюцца, што ў пераходах на станцыях метро, у тунэлях да цягнікоў і электрычак, у падземных бізнес-лабірынтах часта гучыць жывая музыка, праходзяць маленькія гала-канцэрты пад мармуровымі скляпеннямі. Стала нормай, што музыканты нясуць пазітыўны настрой і ўтвараюць незвычайную аўру.

Мне часта даводзіцца карыстацца сталічным метро і менавіта ў пераходах да станцыі я сустракаю гітарыстаў і скрыпачоў, баяністаў і акардэаністаў, саксафаністаў і флейтыстаў, якіх таксама называюць артыстамі «андэграўнду». Аднойчы ў пераходзе на станцыі «Плошча Якуба Коласа» назіраў і слухаў, як музыка ў каўбойскім капелюшы выконваў на банджа кантры так па-заліхвацку, што я міжволі прыняў яго за чалавека з Новага Свету. Насамрэч за мянушкай Біл хаваецца крэатыўны мінчук, які ў свой час змяніў шасціструнную гітару на банджа.

На мінулым тыдні ў пераходзе на станцыі «Усход» сваёй скрыпкай пешаходаў зачароўваў госць з Полацка Алег КАСЦЮКОВІЧ. Маэстра выконваў вядомую ўсім «класіку» — Баха, Шапэна, Шуберта.

— У мяне спецыяльны рэпертуар для такіх выступленняў, — падзяліўся Алег Касцюковіч. — Мне давялося вандраваць са сваёй скрыпкай па ўсёй Еўропе, люблю іграць сапраўдныя музыкальныя шэдэўры.

На станцыі метро «Інстытут культуры», у адным з самых вялікіх сталічных пераходаў музычныя шэдэўры выконвае і немалады флейтыст. У яго выкананні вядомая мелодыя «Белавежскай пушчы» гучыць проста фантастычна.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.**



*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*



Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ПАКАЁВУЮ РАСЛІНУ, У ЯКОЙ ЖОЎКНЕ ЛІСЦЕ

**Пажаўценне лісця з'яўляецца адной з першых прыкмет таго, што расліна дрэнна сябе адчувае. Прычыны могуць быць розныя — ад недахопу вільгаці або празмернага паліву да з'яўлення шкоднікаў.**



## Праверка на стрэс з-за вільгаці

Калі вы заўважылі, што лісце расліны жоўкне, неабходна ўпэўніцца ў адсутнасці прыкмет стрэсу. Найбольш распаўсюджаным стрэсавым фактарам для раслін з'яўляецца занадта вялікая ці занадта малая колькасць вады. Каб даведацца, колькі вільгаці атрымлівае расліна, апусціце палец на 2-3 сантыметры ў яе глебу (не правярайце паверхню глебы, яна звычайна высыхае хутчэй).

Дыягназ: калі глеба на глыбіні 2-3 сантыметраў сухая, то, магчыма, расліна адчувае смагу. Напаіце яе як мага хутчэй і пастарайцеся паліваць больш рэгулярна. А калі глеба на глыбіні 2-3 сантыметраў будзе вельмі вільготнай, то расліна атрымлівае занадта шмат вады. Неабходна ўпэўніцца ў адсутнасці прыкмет гнілі каранёў, напрыклад паху цвілі. Калі ёсць падазрэнне, што расліна пераўвільготнена, адрэгулюйце графік паліву і пастарайцеся перасадзіць яе ў кантэйнер з лепшым дрэнажом.

## Шукаем шкодных стварэнняў

Недастатковае ці празмернае ўвільгатненне глебы — найбольш распаўсюджаная прычына пажаўцення лісця. Але калі яна выключана, то, магчыма, вінаватыя шкоднікі. Напрыклад, павуцінныя кляшчы могуць лёгка загубіць расліну.

Звярніце ўвагу на змяненне колеру і формы лістоў. Аглядзіце іх уважліва з абодвух бакоў. Ці ёсць на іх малюсенькія адтуліны і дробныя насякомыя? Павуцінныя кляшчы абцягваюць расліну тонкай павуцінай. А калі заўважылі на лісці расліны пухнаты белы налёт, то вінаватымі могуць быць мучністыя чарвяцы. Паспрабуйце прамыць расліну, абрэзаць пашкоджанае, завялае лісце, а затым апырскайце расліну набытым у краме інсектыцыдным спрэем.

## Даць доступ да сонца

Яшчэ адна магчымая прычына, што лісце расліны жоўкне, у тым, што ёй не хапае сонечнага святла. Калі ў вашай кватэры не вельмі шмат натуральнага святла, то, відаць, прыйшоў час для сонечных ваннаў.

Калі расліна стаіць у цёмным куце, разгледзьце магчымасць перасяліць яе ў светлае месца або давайце ёй штодня пару гадзін знаходзіцца на сонцы каля акна. Пры гэтым уважліва назірайце, як яна спраўляецца з пастаянным перасоўваннем, таму што некаторым адчувальным раслінам можа быць цяжка да гэтага прыстасавацца.

## Абараніць ад скразнякоў

Многія пакаёвыя расліны з'яўляюцца трапічнымі і, адпаведна, не любяць халоднага надвор'я і скразнякоў. Калі вы трымаеце пальму побач з пастаянна прыадчыненым акном, то не здзіўляйцеся, калі яе лісце пажоўкне.

Падумайце, ці можа расліна застудзіцца, і памятайце, што скразнякі магчымыя не толькі ўзімку. Расліне можа шкодзіць і празмерна актыўны кандыцыянер. Таксама майце на ўвазе, што чым халаднейшае паветра ў кватэры, тым радзей трэба паліваць расліну, таму што вільгаць будзе выпарацца больш павольна. У адваротным выпадку вы яшчэ і затопіце сваю расліну.

## Пераканацца, што не галадае

Можна думаць, што расліна атрымлівае ўсе неабходныя пажыўныя рэчывы з глебы, але калі лісце жоўкне, магчыма, гэта паказвае на недахоп пажыўных рэчываў, які перашкаджае фотасінтэзу.

Калі старэйшае лісце на расліне жоўкне, а маладыя лісточкі вырастаюць светла-зялёнымі, гэта можа быць прыкметай дэфіцыту азоту. Шукайце падкормку з гэтым рэчывам і прытрымлівайцеся рэкамендаванай нормы, каб пазбегнуць апёку ўгнаеннем. Пры правільнай колькасці «ежы» расліна зноў стане зялёнай і прыгожай.

# Зімовы часнок можна садзіць і вясной

**Лішкі часнаку, якія не былі спажытыя за зіму, лепш за ўсё разабраць на зубкі, ачысціць ад луски і адразу ж замачыць у любым растворы стымулятару росту на 7—9 гадзін. Пасля гэтага неабходна ўзяць мяккую анучу, намачыць яе, адціснуць і скласці ў яе зубкі часнаку, пакласці ў поліэтыленавы пакет (але ні ў якім разе шчыльна не закрываць).**

Усё гэта прыбраць у халадзільнік. Звычайна часнок вясной падрыхтоўваюць за месяц да пасадкі. Яшчэ адзін важны момант: нельга дапускаць, каб тканіна высахла, яе варта перыядычна змочваць вадой. На працягу месяца ў зубкоў часнаку з'яўляюцца карані даўжынёй да пяці сантыметраў.

Як толькі зямля прагрэецца і будзе стаяць нармальнае надвор'е, можна будзе пачаць пасадку. Лепш за ўсё на градцы зрабіць баразёнку глыбінёй каля 10 сантыметраў, у ёй раскласці прарослыя зубкі. Баразёнку неабходна засыпаць перагноем. Гэты часнок, у адрозненне ад таго, што вы пасадзіце яшчэ з восені, будзе расці некалькі даўжэй, але ён атрымаецца больш буйным. За лета рэкамендуецца пару разоў падкарміць часнок мінеральнымі ўгнаеннямі.

І яшчэ. Улетку варта пакідаць 5-6 стрэлак з бульбачкай, каб кантраляваць рост. Як толькі абалонка на іх лопаецца, можна спакойна выкопваць часнок.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.19 | 18.28 | 10.09 |
| Віцебск — | 8.12 | 18.15 | 10.03 |
| Магілёў — | 8.09 | 18.18 | 10.09 |
| Гомель — | 8.13 | 18.18 | 10.05 |
| Гродна — | 8.34 | 18.44 | 10.10 |
| Брэст — | 8.31 | 18.47 | 10.16 |

## Месяц

*Поўня ў 18.53.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Лукі, Парфена.*
**К.** *Анеты, Людмілы, Леха, Лявона, Юльяна.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**20 ЛЮТАГА**

**У краіне**

**1350** год — нарадзіўся Вітаўт, вялікі князь літоўскі. Увайшоў у гісторыю як адзін з самых выдатных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага. У 1374 годзе атрымаў Гарадзенскае княства. Прыняў удзел у заключэнні Крэўскай уніі 1385 года. Праводзіў самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку, ажыццяўляў цэнтралізацыю дзяржавы, паступова ліквідоўваючы буйныя ўдзельныя княствы. У 1395 годзе падпарадкаваў Смаленскае княства. У выніку заключэння з Польшчай Віленска-Радамскай уніі 1401 года атрымаў афіцыйна тытул вялікага князя літоўскага. Гарадзельская унія 1413 года замацавала ўладу Вітаўта ў ВКЛ. У 1416 годзе ён арганізаваў праваслаўную мітраполію ў ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку. Падпарадкаваў свайму ўплыву Пскоў і Цвер, пашырыў уплыў на Маскву. Пры Вітаўце ВКЛ дасягнула найбольшай магутнасці. Памёр у 1430 годзе.

**1947** год — нарадзіўся (в. Вялікае Стахава Барысаўскага раёна) Валерый Яўгенавіч Мазынскі, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У 1976—1989 гадах галоўны рэжысёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа, адзін з ініцыятараў стварэння пры тэатры беларускага тэатра «Лялька». Заснавальнік, у 1993—2000 гадах мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Паставіў спектаклі «Сымон-музыка», «Парог», «Вечар», «Радавыя» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

**У свеце**

**1729** год — нарадзіўся Фёдар Рыгоравіч Волкаў, рускі акцёр і тэатральны дзеяч, які стварыў першы пастаянны рускі тэатр. Лічыцца заснавальнікам рускага тэатра. Памёр у 1763 годзе.

**1901** год — у «Определении Святейшего синода», надрукаваным у «Церковных ведомостях» 20—22 лютага 1901 года, было абвешчана аб адлучэнні пісьменніка Л. М. Талстога ад Праваслаўнай царквы.

**1909** год — у парыжскім часопісе «Фігаро» быў апублікаваны «Маніфест футурызму», які азнаменаваў нараджэнне авангардысцкай мастацкай плыні 1910-х — пачатку 1920-х гадоў. Найбольш поўна праявілася ў Італіі і Расіі.

**1926** год — нарадзілася Зінаіда Партнова, удзельніца камсамольскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1958 год, пасмяротна). З 1942 года член камітэта Обальскага камсамольскага падполля. Распаўсюджвала лістоўкі, удзельнічала ў дыверсіях. Разведчыца партызанскага атрада імя Варашылава брыгады імя Леніна пранікала ў варожыя гарнізоны, здабывала каштоўныя звесткі. У снежні 1943 года пасля выканання чарговага задання схопленая фашыстамі. На допыце застрэліла нямецкага афіцэра. Закатаваная гітлераўцамі ў 1944 годзе.



## УСМІХНЕМСЯ

**Да двух гадоў быў дзіка папулярны ў жанчын. Самі падбягалі, усміхаліся, цалавалі і літаральна насілі на руках.**

— Міша, ты ж сёння хацеў на працу ісці ўладкоўвацца?!
— Ну так, дарагая, хацеў...
— І што?!
— Дык дождж жа.

**Ахоўнік інтым-крамы ноччу не спіць: баіцца, што цацкі ажываюць...**

Жонка — мужу:
— Ну скажы мне штонебудзь. Чаго ты маўчыш? Ты мяне проста нервуеш сваім маўчаннем! Ну, я чакаю...
— Што табе сказаць?
— Заткніся, сволач!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 598.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 19 лютага 2019 года.